Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

31 КАСТРЫЧНІКА 2014 г. ПЯТНІЦА № 208 (27818) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

Фасоля па-бразільску

СТАР. 5

Як не зруйнаваць памяць?

СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар ШУНЕВІЧ, міністр унутраных спраў:

«Антыкарупцыйнае, як і любое іншае, заканадаўства не з'яўляецца статычным. Развіваюцца грамадскія адносіны, змяняюцца эканамічныя ўмовы, адначасова з'яўляюцца новыя супрацьпраўныя схемы і карупцыйныя рызыкі. Адпаведна павінны выпрацоўвацца і меры па іх нейтралізацыі. Дзейная нарматыўная прававая база ў гэтай сферы ў Беларусі пастаянна ўдасканальваецца. Сярод найбольш істотных навацый законапраекта, які цяпер абмяркоўваецца, — увядзенне механізму вяртання ў даход дзяржавы незаконнага ўзбагачэння, атрыманага дзяржаўнай службовай асобай, і забарона паўторнага прыёму на дзяржслужбу тых, хто раней быў звольнены з яе па дыскрэдытуючых абставінах. Таксама прадугледжваецца пазбаўленне права на пенсійнае забеспячэнне ў адпаведнасці з Законам «Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь» і ўдасканаленне парадку дэкларавання даходаў і маёмасці службовых асоб, якія займаюць адказнае становішча».

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 31.10.2014 г.

Долар ЗША	10710,00	■
Еўра	13480,00	▼
Рас. руб.	247,00	▼
Укр. грыўня	830,23	▲

ISSN 1990 - 763X

З чыстых вытокаў

Рака Дзісна на Віцебшчыне «поіць» вадой не адзін населены пункт рэгіёна. Але сама рака «п'е» шматлікія ручаі і рачулкі, што ў яе ўпадаюць. Менавіта аб чысціні прытокаў Дзісны клапаціліся школьнікі і настаўнікі рэгіёна, якія ўдзельнічалі ў праекце «Малыя рэкі — вялікія праблемы». На працягу дня падчас канікул больш за паўсотні дзяцей і дарослых збіралі па берагах рэк смецце. І невялічкія рэкі, і сама Дзісна, несумненна, уздыхнулі лягчэй.

■ Надвор'е

У НОЧ НА НЯДЗЕЛЮ — МОКРЫ СНЕГ

У апошні дзень кастрычніка тэрыторыя нашай краіны трапіць пад уплыў зоны павышанага ціску, якая была сфарміравана ў халодным паветры над Балтыйскім морам, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Таму істотных ападкаў не будзе, а тэмпература паветра ў сярэдзіне дня складзе 3-9 цяпла. Не зменіцца характар надвор'я і ў суботу, толькі ўдзень па паўночным захадзе пройдзе кароткачасовы дождж. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман і слабы галалёд. Тэмпература паветра ў ноч на суботу будзе вагацца ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, пры праясненнях месцамі да 5 марозу. Удзень чакаецца плюс 3-10 градусаў. А ў нядзелю да нас завітае атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы. Таму ўначы і раніцай чакаюцца невялікія ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі туман і галалёд. Удзень без істотных ападкаў. Уначы прагназуецца ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, па ўсходзе Беларусі — да 8 марозу.

Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 3-10 цяпла. Цяплей будзе толькі ў заходніх раёнах краіны, дзе ўначы — 3-5 цяпла, а ўдзень — плюс 11-13 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня на тэрыторыю Беларусі завітаюць паветраныя масы з Цэнтральнай Еўропы. Пры павышаным атмасферным фоне істотных ападкаў не прадбачыцца. Уначы будзе ад 0 да мінус 7 градусаў, а вось удзень стане 5-11 цяпла. Сапраўды камфортнае надвор'е чакаецца на наступным тыдні да серады на захадзе краіны. Там уначы будзе 3-5 цяпла, а ўдзень — сонечна і да плюс 11-13 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ

■ Спецыяльны рэпартаж

«СЁННЯ БОЛЬШ ПРЫСТОЙНАЯ ПУБЛІКА ПРЫЙШЛА»

На Мінскім агульнагарадскім кірмашы вакансій суіскальнікаў працоўных месцаў стала значна больш

— Мне б мулярам уладкавацца... — 52-гадовы Васіль Аркадзьевіч спыніўся каля стэнда электрамеханічнага завода «Агат».
— Які ў вас заробак?
— Пяць мільёнаў. Прадпрыемства ў цэнтры горада, зарплата стабільная. Прыйшоў, адпрацаваў і пайшоў, — пералічвае ўсе выгады працы ў іх прадстаўнік прадпрыемства. — Вы цяпер не працуеце?
— Падпрацоўваю пакуль дзе прыйдзецца, цяпер вось траншэі капаем... — няпэўна адказвае той і адыходзіць.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

На мінскім агульнагарадскім кірмашы вакансій шматлюдна. У зале стаіць гул соцень галасоў. Прадстаўнікі мінскіх прадпрыемстваў і шукальнікі працы прыглядаюцца адзін да аднаго.

СТАР. 2

АБ'ЯДНАЦЦА СУПРАЦЬ ЗЛА

Супрацьстаяць тэрарызму можна толькі агульнымі намаганнямі

Учора ў Мінску стартавала Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Партнёрства дзяржавы, грамадскага сектара і дзелавой супольнасці ў барацьбе з тэрарызмам — бяспека праз дыялог, згоду і ўзаемадзеянне». Гэта першая падобнага кшталту канферэнцыя сабрала разам прадстаўнікоў службаў бяспекі розных краі (Беларусі, Расіі, Украіны, Інданезіі, Казахстана, Амерыкі, Еўрапейскага саюза і іншых) і міжнародных арганізацый (АБСЕ, АДКБ, СНД, Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі), а таксама, грамадскіх дзеячаў, вучоных і банкіраў. Такім чынам, Мінск зноў стаў зручнай пляцоўкай для абмеркавання надзённых праблем, якія хвалююць сусветную суполку. Удзельнікі канферэнцыі былі згодны з тым, што сёння не засталося ў свеце месцаў, дзе б не існавала пагрозы тэрарызму.

Пра новыя пагрозы з боку інфармацыйнай глабалізацыі гаварыла і **міністр інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ**. «Нацыянальныя тэлеканалы, нацыянальны перыядычны друк у поўнай меры фарміруюць інфармацыйную палітыку дзяржавы, — сказала яна пра сітуацыю ў нашай краіне. — Але мы павінны ўлічваць і тое, што працуем у агульнай інфармацыйнай прасторы, якая з улікам развіцця новых глабальных тэхналогій, інтэрнэту, разам з новымі магчымасцямі нясе і новыя пагрозы. Таму інфармацыйная бяспека краіны павінна будавацца не толькі на абароне, але ў многім на якаснай працы нацыянальнага інфармацыйнага поля».

Лілія Ананіч нагадала, што пры Міністэрстве інфармацыі рашэннем урада не так даўно была створана рэспубліканская экспертная камісія па ацэнцы інфармацыйнай прадукцыі на прадмет наяўнасці або адсутнасці ў ёй прыкмет праяў экстрэмізму. «Ужо па першых кроках работы камісіі відаць, што ёсць дастатковы паток інфармацыйнай прадукцыі, які заслугоўвае разгляду, — сказала міністр. — У складзе камісіі прафесіяналы, эксперты ў розных галінах ведаў (філалогіі, рэлігіязнаўства) і тыя, хто па доўгу службы закліканы ажыццяўляць свае функцыянальныя абавязкі па барацьбе з экстрэмізмам і тэрарызмам. Думаю, імі будзе дадзена кваліфікаваная ацэнка і інфармацыйнае поле Беларусі будзе надзейна абаронена».

Дыялогу, цярпімасці і разуменню паміж цывілізацыямі, культурамі, народамі і рэлігіямі была прысвечана работа адной з секцый канферэнцыі. На ёй ішла размова пра саюзныя адносіны паміж дзяржавамі, ролю статусу дзяржаўнай мовы, СМІ і інтэрнэту ў міжнацыянальнай згодзе, а таксама пра ідэалагічныя асновы тэрарызму.

— Беларусь становіцца ініцыятарам многіх добрых спраў, якія набываюць вядомасць ва ўсім свеце, — сказаў журналістам перад пачаткам канферэнцыі **рэктар Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО», доктар юрыдычных навук, прафесар Станіслаў КНЯЗЕЎ**. — Сёння тут сабраліся прадстаўнікі многіх краін нашай планеты, каб абмеркаваць праблемы барацьбы з тэрарызмам. Тэрарызм — гэта зло, якое мае, на жаль, вялікія маштабы, бо ў свеце развіваецца вострая канкурэнтная барацьба. Тэрарызм — гэта самая вострая форма палітычнай барацьбы. Мы павінны змагацца з гэтым злом, абараняць людзей, дзяржаву ад таго, што ён нясе: гвалт, жах, смерць невінаватых, разбурэнне каштоўнасцяў, якія чалавецтва назапашвала тысячагоддзямі. Гэта — надзённая праблема.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Станіслаў Князеў лічыць, што з-за развіцця нанатэхналогій, інтэлектуальных сістэм і рабатызацыі, якія ўсё больш выціскаюць чалавека са сферы працы, адбываецца маргіналізацыя значнай часткі грамадства. У выніку людзі робяцца жорсткімі, чым карыстаюцца тыя, каму цікава стварацца сацыяльнае напружанне, каб нешта выйграць у канкурэнтнай барацьбе. «Лішнія людзі», якім няма чым сябе заняць, уцягваюцца ў баявыя дзеянні, іх спецыяльна вучаць забіваць і плацяць за гэта грошы.

Сёння, у другі дзень працы канферэнцыі, яе ўдзельнікі наведаюць палігон, дзе ўбачаць тэхналогіі барацьбы з тэрарызмам, якімі валодае наша краіна.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■ Праблемы і рашэнні

ГАВОРЫМ «ІНВЕСТАР» — МАЕМ НА ЎВАЗЕ «ГАСПАДАР»

Як развіваецца Мінская вобласць? З якімі праблемамі сутыкаецца прамысловасць, сельская гаспадарка і як яны вырашаюцца? На гэтыя і іншыя пытанні адказаў на выязной прэс-канферэнцыі ў Вілейцы старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Сямён Шапіра.

«ГІГАНТЫ» ПРАЦУЮЦЬ НАПАЎСІЛЫ

Мінская вобласць дасягнула нядрэнных тэмпаў росту валавога рэгіянальнага прадукту. За восем месяцаў сёлета — 104,4% пры прагнозе да 102%. Некаторыя аналітыкі звязваюць гэты вынік з паспяховай работай «Беларуськалія». «І гэта сапраўды так, — пагаджаецца кіраўнік вобласці. — Таварыства працуе на поўную магутнасць. Апошнім часам намецілася тэндэнцыя павышэння цэн на яго прадукцыю. У наступным годзе, чакаецца, яна прадоўжыцца, што стане сур'ёзнай крыніцай паступлення валюты ў краіну».

Але, на жаль, іншыя гіганты прамысловасці працуюць напаўсілы. Гэта датычыцца і ААТ «БелАЗ». Шмат праблем у рабоце прамысловасці Барысава. Справа ў тым, што там, галоўным чынам, размешчаны прадпрыемствы, якія вырабляюць вузлы і агрэгаты для Расійскай Федэрацыі, дзе вытворчасць машын знізілася. «Мы сталі заложнікамі эканамічнай сітуацыі, што склалася ў Расіі. Таму распрацоўваюцца адпаведныя меры па дыверсіфікацыі вытворчасці, выпуску іншых новых відаў прадукцыі, арыентаваных на розных спажыўцоў», — адзначыў Сямён Шапіра.

ЗА МЯЖУ — ТОЛЬКІ ГАТОВЫЯ ПРАДУКТЫ

Сёлета, на жаль, Мінскай вобласці не ўдалося дасягнуць пастаўленых задач па экспарце прадукцыі. Для выпраўлення сітуацыі распрацаваны спецыяльны план. У першую чаргу мяркуецца нарошчваць пастаўкі за мяжу за кошт мясной і малочнай прадукцыі. «Мы ставім задачу перад мясакамбінатамі і малочнымі заводамі павялічыць колькасць змен, каб вырабляць і адпраўляць больш гатовых прадуктаў з высокім дабаўленым коштам у Расійскую Федэрацыю і, адпаведна, павялічыць даходы ад экспарту. Раней на рынак суседкі, як правіла, ішлі сыравіна, паўфабрыкаты.

СТАТАК СВІНЕЙ ПАВЯЛІЧЫЦЦА

Пагалоўе свіней у вобласці плануецца давесці да 880 тысяч. З-за пагрозы АЧС іх статак зменшыўся амаль на 130 тысяч: са 180 невялікіх фермаў закрыты 130. На кожнай у сярэднім утрымлівалася каля 1000 асобін. Некаторыя з іх будуць адноўлены. Як адзначыў Сямён Шапіра, на Міншчыне задзейнічаны рэзервы для выпраўлення сітуацыі. У прыватнасці, за кошт будаўніцтва буйных свінакомплексаў. Напрыклад, узводзіцца свінакомплекс на 24 тыс. галоў у Салігорскім раёне. У перспектыве яго вытворчасць плануецца пашырыць удвая. Цяпер ужо вызначаны графік пастаўкі сюды бацькоўскага статка. Вялікія комплексы будуюцца ў Любанскім і Слуцкім раёнах. У Слуцку праект рэалізоўваўся сумесна з італьянцамі. Усе неабходныя работы на свінакомплексе беларусы завяршаюць самастойна: ідзе наладка абсталявання, праводзяцца тэндары на закупку пагалоўя.

У ВЁСКУ ІДЗЕ КАПІТАЛ

Што тычыцца ў цэлым сельскай гаспадаркі, то ў гэтую сферу таксама прыходзіць капітал. «Сёння вялікую цікаваць да нашых сельгаспрадпрыемстваў праяўляюць інвестары, як айчынныя, так і замежныя. Напрыклад, адзін з іх прапаноўвае ўкласці ў сельскую гаспадарку каля 300 млн долараў. Мы стварылі рабочую групу, якая вывучыць сітуацыю, узважыць усе «за» і «супраць». Як правіла, мы прапаноўваем усім ахвотным раёны, якія знаходзяцца ў найгоршым тэхналагічным, кадравым, фінансавым становішчы», — канстатаваў Сямён Шапіра.

Кіраўнік цэнтральнага рэгіёна — таксама за развіццё фермерства на тэрыторыі вобласці. Многія фермеры даказалі на справе, што могуць добра гаспадарыць на зямлі. Напрыклад, у Крупскім, Лагойскім, Дзяржынскім і Маладзечанскім раёнах фермеры атрымалі ад 380 да 480 цэнтнераў бульбы з гектара. Гэта значна больш, чым у асобных рэгіёнах вобласці. «У многіх раёнах ёсць пакуль не занятыя землі. Яны могуць быць выкарыстаны для вырошчвання розных культур паспяховымі фермерскімі гаспадаркамі. Сёння яны займаюцца бульбай, агародніцтвам, а заўтра прыйдуць і ў жывёлагадоўлю. Наогул, 50-60% жыхароў Міншчыны працуюць на прадпрыемствах прыватнай формы ўласнасці. Там, дзе добры гаспадар, як правіла, і зарплаты добрыя. Таму працэсы, якія цяпер адбываюцца ў сельскай гаспадарцы з удзелам прыватнікаў, будзем стымуляваць», — зрабіў выснову Сямён Шапіра.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■ Рэйтынг

УМОВЫ ДЛЯ БІЗНЕСУ ПАЛЕПШЫЛІСЯ

Міжнароднае даследаванне прызнала, што Беларусь правяла добрую рэформу ў сферы падаткаабкладання

Грамадскасці прадстаўлены чарговы (дванаццаты) даклад Сусветнага банка і Міжнароднай фінансавай карпарацыі (IFC) «Вядзенне бізнесу-2015. Выходзячы за рамкі эфектыўнасці». Беларусь заняла 57-е месца сярод ахопленых гэтым даследаваннем 189 дзяржаў.

Паводле справаздачы «Вядзенне бізнесу-2014», апублікаванай у кастрычніку мінулага года, наша краіна займала 63-е месца. «Разам з тым, пасля традыцыйнага перагляду вынікаў папярэдняга перыяду, звязанага з абнаўленнем звестак, заснаваным на прадстаўленых краінамі-ўдзельніцамі даследаваннях, у тым ліку Беларуссю, дадатковых матэрыялах і каментарыях, фармальна лічыцца, што наша краіна займала ў справаздачы «Вядзенне бізнесу-2014» не 63-е, а 57-е месца», — удакладняюць у прэс-службе Міністэрства эканомікі.

У любым выпадку, згодна з вынікамі сёлетняга даследавання, наша краіна выглядае больш прывабна на фоне краін — партнёраў па Мытным саюзе і АЭП: Расія займае 62-е месца, Казахстан — 77-е. Топ-ліст справаздачы ў чарговы раз узначаліў Сінгапур. Далей ідуць: Новая Зеландыя; Ганконг, Кітай, Данія; Рэспубліка Карэя, Нарвегія, ЗША, Вялікабрытанія, Фінляндыя і Аўстралія. Замыкае рэйтынг Эрытрэя (вельмі маладая дзяржава Усходняй Афрыкі, якая атрымала незалежнасць ад Эфіопіі ў 1993 годзе).

Сярод краін постсавецкай прасторы самае высокае, 15-е месца, займае Грузія (14-е месца годам раней). Следам за ёй ідзе Эстонія — 17-е месца (16-е годам раней), Латвія — 23-е (21-е годам раней), Літва — 24-е (тая ж пазіцыя годам раней), Арменія — 45-е (49-е месца годам раней), Малдова — на 63-м (82-е годам раней), Украіна — на 96-м (112-е годам раней), Азербайджан на 80-м (88-е годам раней), Узбекістан — на 141-м (149-е годам раней), Таджыкістан — на 166-м месцы ў спісе (177-е годам раней).

Рэйтынг жа нашай краіны вырас па трох паказчыках. Найбольшы прагрэс адзначаны ў катэгорыі «Падаткаабкладанне» (+47 пунктаў) за кошт значнага скарачэння колькасці гадзін, якія выдаткоўваюцца на выплату падаткаў (з 319 да 183), а таксама за кошт скарачэння агульнай колькасці плацяжоў у год (з 10 да 7) і агульнай падатковай стаўкі (% ад прыбытку) — з 54% да 52%. Палепшаны таксама значэнні па паказчыках «Атрыманне дазволу на будаўніцтва» (+3 пазіцыі) і «Міжнародны гандаль» (+1 пазіцыя). У справаздачы «Вядзенне бізнесу-2015» сказана, што Беларусь правяла станоўчую рэформу ў сферы падаткаабкладання. Спрошчаны працэс падаткаабкладання для кампаній за кошт укаранення электроннай сістэмы дэкларацый і выплаты абавязковых узносаў па страхаванні ад няшчасных выпадкаў на працоўным месцы, а таксама за кошт спрашчэння патрабаванняў да правілаў падачы дэкларацый па падатку на прыбытак прадпрыемстваў і падатку на дабаўленую вартасць.

«У цэлым вынікі даследавання паказалі, што, нягледзячы на наяўныя дасягненні ў стварэнні спрыяльных умоў для развіцця бізнесу, рэзерв у гэтым кірунку для нашай краіны застаецца значным. Урад мае намер і далей праводзіць рэформы ва ўсіх сферах прадпрымальніцкай дзейнасці, улічваючы рэкамендацыі Сусветнага банка і станоўчы вопыт замежных краін, з мэтай развіцця прыватнага сектара эканомікі», — паведамілі ў прэс-службе Мінэканомікі.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

Даследаванне «Вядзенне бізнесу» ўяўляе сабой серыю штогадовых дакладаў, прысвечаных вывучэнню ўмоў стварэння і функцыянавання нацыянальных малых і сярэдніх прадпрыемстваў з дапамогай ацэнкі нормаў рэгулявання 11 асноўных этапаў «жыццёвага цыкла» суб'ектаў гаспадарання: стварэнне кампаніі, атрыманне дазволаў на будаўніцтва, падключэнне да сістэмы электразабеспячэння, рэгістрацыя ўласнасці, атрыманне крэдытаў, абарона правоў мінарытарных інвестараў, падаткаабкладанне, міжнародны гандаль, забеспячэнне выканання кантрактаў і вырашэнне неплацежаздольнасці прадпрыемстваў. Таксама вымяраецца рэгуляванне рынку працы, але сёлета гэты паказчык не ўваходзіць у рэйтынг.

УЗРАСТАЮЦЬ ДЗІЦЯЧЫЯ ДАПАМОГІ

У сувязі з тым, што ў краіне зацверджаны новы бюджэт пражыткавага мінімуму (БПМ), узрастуць памеры некаторых відаў дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей.

Аднаразовая дапамога пры нараджэнні першага дзіцяці складзе 13 960 200 рублёў (цяпер 13,4 млн), другога і наступных — 19 544 300 рублёў замест цяперашніх 18,8 млн.

Дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў на першае дзіця раўняецца 35% ад сярэдняй зарплаты за апошні квартал, з лістапада па студзень яе памер складзе 2 233 950 рублёў. Дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў на другое і наступных дзяцей раўняецца 40% ад сярэдняй зарплаты, і яе памер складзе 2 553 100 рублёў. Дапамога на дзіця-інваліда прызначаецца ў памеры 45% сярэднямесячнай заработнай платы незалежна ад чарговасці нараджэння дзяцей у сям'і, з лістапада па студзень яна будзе раўняцца 2 872 200 рублёў.

Дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў пры пражыванні на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання ў зоне наступнага адсялення або з правам на адсяленне прызначаецца і выплачваецца ў памеры 150% да ўстаноўленай законам.

❍❍❍

Штомесячная дапамога на дзяцей, старэйшых за 3 гады, з асобных катэгорый сем'яў, якія вызначаюцца заканадаўствам, на дзіця-інваліда (70% БПМ) будзе раўняцца 977 200 рублёў, на іншых дзяцей у сям'і (50% БПМ) — 698 тыс. рублёў. Штомесячная дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў (100% БПМ) складзе 1 396 000 рублёў; штомесячная дапамога на дзіця ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраванае ВІЧ (70% БПМ) — 977 200 рублёў.

Святлана БУСЬКО.

Стаць «студэнтам» яшчэ... у школе

Установачная сесія вочна-завочнай педагагічнай гімназіі распачала работу на базе Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.

Вочна-завочная гімназія — новая структура, створаная на базе БДПУ. Яе работа разлічана на старшакласнікаў, зацікаўленых у атрыманні прафесіі педагога. Вочная форма прадугледжвае лекцыйныя заняткі ва ўніверсітэце, якія праводзяцца ў канікулярны час. А завочная (дыстанцыйная форма) навучання азначае самастойную работу з наступным кантролем за поспехамі навучэнцаў з боку выкладчыкаў. Навучанне праводзіцца па трох кірунках: фізіка-матэматычным, прыродазнаўча-навуковым (хімія, біялогія, геаграфія) і філалагічным (беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура і замежная мова). Навучэнцы самі выбіраюць найбольш блізкі ім профільны кірунак.

Навучанне ў вочна-завочнай педагагічнай гімназіі дае старшакласнікам дадатковыя прэферэнцыі: гэта не толькі магчымасць акунуцца ў студэнцкае жыццё, але і пераважнае права на паступленне ў БДПУ пры роўнай колькасці балаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ На кантролі

ВЫВЕСЦІ НА ЧЫСТУЮ ВАДУ...

Плануюць Мінск да 2020 года

І гэта цалкам магчыма, бо ўжо ўся Беларусь, апроч сталіцы, карыстаецца вадой з падземных крыніц, што ўдалося дасягнуць дзякуючы рэалізацыі дзяржпраграмы «Чыстая вада».

Ужо да 2020 года сталіца можа цалкам перайсці на ваду з падземных крыніц, лічыць **начальнік упраўлення гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама Дзмітрый ЯНЧЫК**, хаця тэрмін запланаванага пераходу пазнейшы — 2030 год.

Дарэчы, па словах **намесніка начальніка вытворча-тэхнічнага аддзела вытворчасці «Мінскводаправод» УП «Мінскводаканал» Рустама МАМЕДАВА**, цяпер спажыванне вады значна паменшала ў параўнанні з савецкім часам. Можа быць, справа ў лічыльніках, якія ўстаноўлены ў больш як 90% сталічнага жылля і ў 98% усяго жылфонду краіны? Прынамсі, дзякуючы ім у Мінску водаспажыванне знізілася прыкладна на 30%, а ў Беларусі ў цэлым — больш чым напалову. Хаця лічбы ўражваюць сваёй колькасцю і цяпер: за суткі карыстальнікам у Мінску падаецца 500 тысяч кубаметраў вады.

Што да якасці вады, якую выкарыстоўваюць беларусы, яна вельмі добрая, адзначаюць спецыялісты.

«Па мікрабіялагічных паказчыках нестандартныя пробы ў нас на ўзроўні 1%, пры тым, што Сусветная арганізацыя аховы здароўя дае наступную рэкамендацыю: калі працэнт нестандартных проб па мікрабіялагічных паказчыках менш за 5, значыць, ваду можна піць з крана», — адзначыла **загадчыца аддзялення камунальнай гігіены Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына ЖАЎНЯК**.

Адзіная праблема па ўсёй краіне — высокая колькасць утрымання жалеза ў падземных водах. Для яе вырашэння будуюцца станцыі абезжалезвання. Так, да канца 2014 года будуць уведзены дзве новыя станцыі — «Пятроўшчына» і «Феліцыянава». Увод такіх станцый, як мяркуюць спецыялісты, зможа нават прывесці да зніжэння кошту вады, бо мерапрыемствы па прамыўцы водаправода ад жалеза, што асядае на яго сценках, якія праводзяць цяпер, даволі затратныя.

«Жалеза не з'яўляецца таксічным элементам, а паказчык, па якім устанаўліваюць яго максімальна дапушчальную канцэнтрацыю ў вадзе, — арганалептычны. Гэта значыць, смак, колер і пах, каб было прыемна ваду піць», — патлумачыла Ірына Жаўняк.

Таксама не ўяўляе небяспекі хлор, пры дапамозе якога ваду абеззаражваюць. Па словах спецыяліста, гэта адзіны спосаб зрабіць вадкасць бяспечнай для ўжывання, хаця яе смакавыя якасці ад гэтага, безумоўна, пагаршаюцца.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

■ Будзь у курсе

ДА САМАЛЁТА — ПА РЭЙКАХ

Білет на праезд са сталіцы ў Нацыянальны аэрапорт будзе каштаваць 25 тысяч рублёў

Кошт праезду ад станцыі «Смалявічы» да прыпыначнага пункта «Нацыянальны аэрапорт «Мінск» складзе 14,6 тысячы рублёў.

Нагадаем, што ў лістападзе Беларуская чыгунка пачынае ў тэставым рэжыме эксплуатацыю сучасных дызель-цягнікоў у напрамку Нацыянальнага аэрапорта «Мінск»: 7 лістапада будзе два рэйсы (час адпраўлення са станцыі «Мінск-Пасажырскі» — 16.30 і 20.25), а з 8 лістапада па гэтым маршруце будуць курсіраваць штодня пяць пар сучасных трохвагонных дызель-цягнікоў. Першы будзе адпраўляцца з Мінска ў аэрапорт у 5.35, апошні — у 20.25, распавялі ў прэс-службе БЧ.

У дарозе прадугледжаны адзін прыпынак — у Смалявічах. Гэтая станцыя стане своеасаблівым перасадачным вузлом для пасажыраў, што будуць ехаць у Нацыянальны аэрапорт з Оршы, Віцебска, Магілёва, Барысава, а таксама раённых цэнтраў, размешчаных па маршруце следавання рэгіянальных цягнікоў бізнес-класа Мінск — Орша — Мінск.

Графік руху распрацаваны з улікам раскладу авіярэйсаў, тэхналогіі праходжання пасажырамі ўсіх неабходных працэдур у аэрапорце, а таксама прыбыцця цягнікоў у перасадачных зносінах паміж абласнымі цэнтрамі і Мінскам. Праезд непасрэдна да аэрапорта будзе ўключаць у сябе перавозку на аўтобусе ад прыпыначнага пункта «Нацыянальны аэрапорт «Мінск». Агульны час у дарозе з улікам перасадкі складзе каля 70 хвілін, з якіх 55-56 хвілін зойме пераезд на цягніку. Кошт праезду складзе 25 тысяч рублёў у адзін бок з улікам праезду на аўтобусе. Рэалізацыя білетаў да аэрапорта будзе весціся ва ўсіх пунктах афармлення праязных дакументаў, уключаючы плацежна-даведачныя тэрміналы самаабслугоўвання. Праезд таксама можна будзе аплаціць непасрэдна ў цягніку ў білетных касіраў і праз плацежна-даведачныя тэрміналы самаабслугоўвання, устаноўленыя ў аэрапорце.

Дарэчы, дабрацца да Нацыянальнага аэрапорта можна таксама на аўтобусе з аўтавакзала «Цэнтральны» (кошт квіткоў ад 27 250 рублёў да 30 350 рублёў) або на таксі (кошт паездкі з цэнтра горада да аэрапорта можа даходзіць да 400 тысяч рублёў).

У новых дызель-цягніках прадугледжаны 143 месцы для сядзення. Новы рухомы састаў адпавядае сучасным патрабаванням бяспекі руху і камфорту для пасажыраў. У адным з вагонаў абсталяваная шматфункцыянальная зона для пасажыраў з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, а таксама для пасажыраў з буйнагабарытным багажом.

Сяргей РАСОЛЬКА

■



МІНСК ПА КОЛЬКАСЦІ ВЫШЫННЫХ БУДЫНКАЎ АБЫШОЎ АМАЛЬ УСЕ ГАРАДЫ РАСІІ

У беларускай сталіцы каля 370 будынкаў, вышэйшых за 50 метраў. Больш за ўсё высотак у мікрараёнах Каменная Горка, Паўднёвы Захад, Малінаўка і Уручча, уздоўж буйных магістраляў, уключаючы праспекты Дзяржынскага і Пераможцаў.

Вышыннасць Мінска адлюстравана на карце «Яндэкса». Мяркуючы па ёй, у горадзе пераважаюць пяціпавярховыя будынкі. Спальныя раёны забудаваны ў асноўным дамамі ў 12 паверхаў і вышэйшымі.

Па колькасці будынкаў, вышэйшых за 50 метраў, Мінск абганяюць толькі два гарады Расіі. У Санкт-Пецярбургу каля 800 такіх будынкаў, а ў Маскве — каля 4,5 тысячы. Увысь імкнуцца таксама Екацярынбург і Краснадар (у кожным з іх каля 270 вышынных будынкаў), а таксама Новасібірск (больш за 240).

У Мінску ёсць і некалькі будынкаў, вышэйшых за 100 метраў. Сярод іх — «Ветразь» на Кальварыйскай і бізнес-цэнтр Royal Plaza на праспекце Пераможцаў (абодва — каля 130 метраў). У Санкт-Пецярбургу 7 будынкаў, вышэйшых за 100 метраў, а ў Маскве — каля 90.

Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.

■ Гіпотэзы

У 2015 ГОДЗЕ — АНАМАЛЬНАЯ СПЯКОТА

Спецыялісты NASA прагназуюць, што 2015 год стане беспрэцэдэнтна спякотным, а многія раёны планеты чакае засуха. Анамальную спякоту можна чакаць да пачатку другога квартала наступнага года. Для многіх рэгіёнаў такое «пацяпленне» акажацца неспрыяльным і пагражае засухай.

Прагноз NASA заснаваны на тэндэнцыі апошніх гадоў: тэмпературныя анамаліі фіксуюцца ўсё часцей. 2014-ы не стаў выключэннем. Так, у верасні сярэдняя глабальная тэмпература склала 15,7 градуса па Цэльсію і стала рэкорднай за апошнія 135 гадоў.

Цікава, што раней метэаролагі прагназавалі, што зіма 2014-2015 гадоў, якая неўзабаве наступіць, будзе халаднейшай, чым звычайна. Больш за тое, зямлян чакае халодны цыкл, які працягнецца 30—35 гадоў.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

«СЁННЯ БОЛЬШ ПРЫСТОЙНАЯ ПУБЛІКА ПРЫЙШЛА»

У базе даных службы занятасці сталіцы сёння налічваецца каля 19 тысяч вакансій, прычым 73% з іх — рабочыя спецыяльнасці, кажуць спецыялісты. Найбольшую патрэбу ў кадрах адчуваюць арганізацыі будаўніцтва (30%), прамысловасці (18%), аховы здароўя і прадастаўлення сацыяльных паслуг (12%).

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Гэтыя курсы бясплатныя? — цікавіцца светлавалосая маладая жанчына, якая стаіць ля стэнда з надпісам «Навучанне беспрацоўных грамадзян».

— За іх плаціць дзяржава, — адказваюць ёй.

— І гэта спіс прафесій, у якіх дзяржава зацікаўлена? — удакладняе жанчына.

— Гэта спіс прафесій, у якіх зацікаўлены канкрэтна Мінск.

Падыходзім бліжэй, глядзім: кіроўца пагрузчыка, кладаўшчык, кантралёр-касір, кіроўца тралейбуса, ліфцёр, аператар кацельні, кухар, трактарыст, швачка, электрагазазваршчык, цырульнік і майстар па манікюры... Не трэба мець сямі пядзяў у лбе, каб зразумець, што сталіца востра мае патрэбу ў першую чаргу ў рабочых спецыяльнасцях. А што шукаюць суіскальнікі?

Па накіраванні службаў занятасці з пачатку бягучага года ў арганізацыі сталіцы працаўладкаваны 8,1 тысячы гараджан, з іх 4,9 тысячы беспрацоўных. Прафесійная падрыхтоўка і перападрыхтоўка па прафесіях, запатрабаваных на рынку працы, была арганізавана для 646 чалавек. Да ўдзелу ў аплатных грамадскіх работах прыцягнуты 1,7 тыс. жыхароў сталіцы, з іх 1,2 тыс. беспрацоўных.

— Падыходзяць шмат, але ўсе хочуць працаваць ІТР (інжынерна-тэхнічнымі работнікамі), а нам як паветра патрэбны рабочыя рукі, — кажуць прадстаўнікі Мінскага трактарнага завода. — Прыбіральшчыцы патрэбны... І заробак на многіх вакансіях варты, але не хочуць людзі ісці ў цэх. Цяпер вышэйшая адукацыя вельмі даступная, дыпломам нікога не здзівіш, а вось знайсці талковага рабочага складана. Ці вось падыходзіць здаровы мужык і пытаецца: «Можна ў вас уладкавацца ахоўнікам?»...

❍❍❍

Ля суседняга стэнда абмяркоўваюць нядаўняе выступленне Прэзідэнта на нарадзе па праблемах занятасці і міграцыі ў краіне, у якім ён прайшоўся наконт дармаедаў:

— Пасля гэтага выступлення зусім іншыя людзі пайшлі на наш кірмаш, — кажа адна супрацоўніца. — Я ўвесь час працую на такіх кірмашах. Сёння больш прыстойная публіка, хоць ёсць з кім пагутарыць. А то ў тыя разы ў асноўным школьнікі прыходзілі або асобы, якіх міліцыя прыводзіла. Цяпер хоць можна кагосьці выбраць. Ды і сёння вельмі шмат людзей, нават прыемна працаваць...

❍❍❍

Ля стэнда Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа швейнай вытворчасці яго прадстаўнікі распавядаюць:

— У нас курсы мэтанакіраваныя — вось гэтыя навучаць кроіць штаны, а гэтыя — спадніцы. Ёсць курсы па фларыстыцы, вышыванні...

— А які дакумент выдаецца па заканчэнні? — цікавіцца маладая дзяўчына.

— Сертыфікат дзяржаўнага ўзору. Але гэта ўсё платныя курсы. Калі хочаце бясплатныя, ідзіце па накіраванні Цэнтра занятасці на курсы па шыццю, дзе навучаць і кроіць, і шыць. Пяць месяцаў вучыцеся — і мы вас працаўладкуем, — звяртаецца супрацоўніца да жанчыны сярэдніх гадоў з яркім шалікам на шыі.

— Гэта мой сваяк з Украіны прыехаў, а яго жонка — швачка, але без адукацыі. Дык я даведваюся для яе, — кажа тая.

— Вось вам кантактныя тэлефоны, тэлефануйце...

❍❍❍

Высокае мастацтва таксама мае патрэбу ў рабочых руках: Нацыянальнаму акадэмічнаму тэатру імя Я.Купалы патрабуюцца электраманцёр, слесар па вентыляцыі, галоўны энергетык, інжынер-электронік, каб абслугоўваць пад'ёмна-транспартныя механізмы сцэны. Ля стэнда з пералікам гэтых вакансій стаіць немаладая жанчына і расказвае прадстаўнікам тэатра пра сябе. З размовы становіцца зразумела, што яна пенсіянерка, па адукацыі інжынер-электрык, скончыла Кіеўскі інстытут грамадзянскай авіяцыі. Прыехала ў Мінск з Узбекістана, дзе жыла да гэтага шмат гадоў, і шукае сабе працу.

— А як наогул там людзі жывуць? — цікавіцца ў яе мужчына ў акулярах.

— Не вельмі добра. Таму і раз'язджаюцца.

— Горш, чым мы?

— Вы тут як сыр у смятане! Я ўжо паўтара года тут жыву, дык я атрымліваю асалоду ад тутэйшага жыцця.

Сярэдні ўзровень аплаты працы па заяўленых вакансіях складае 4,3 млн рублёў. Пры гэтым у 23% вакансій заяўлены заробак не перавышае 3 млн, а 11% вакансій прапануюць заробак, большы за 6 млн рублёў.

— Вы збярыце дакументы і прыходзьце да нас як-небудзь, пагаворым больш прадметна, — усміхаецца ёй прадстаўніца аддзела кадраў тэатра.

❍❍❍

Каля стэнда гасцінічна-рэстараннага комплексу Цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі тлумачаць:

— Гэтыя вакансіі толькі для асоб з групай інваліднасці, гэта спецыяльна адведзеныя для іх месцы.

— Трэба ж, а я ўвесь час спецыяльна старалася, каб мне з маімі хваробамі не далі інваліднасці... Так бы цяпер працу знайшла... — кажа адна з наведвальніц кірмашу.

У лік найбольш высокааплатных увайшлі асобныя прапановы па вакансіях муляр (14 млн), абліцоўшчык-плітачнік, тынкоўшчык, маляр, страхар (па 12 млн), машыніст электрацягніка (11,4 млн), тэсціроўшчык праграмнага забеспячэння (27 млн), інжынер-праграміст (26 млн), менеджар па інфармацыйных тэхналогіях (24 млн), менеджар па знешнеэканамічных сувязях (19 млн), шэфкухар (15 млн).

❍❍❍

На кірмашы вакансій размясціліся асобныя стэнды з вакансіямі не толькі для інвалідаў, але і для студэнтаў і пенсіянераў. Сюды прыйшлі прадстаўнікі прадпрыемстваў і арганізацый Мінска, з якімі мог пагутарыць кожны ахвотны. Наведвальнікі маглі атрымаць кансультацыю спецыялістаў службы занятасці па пытаннях працаўладкавання, рэгістрацыі ў якасці беспрацоўных, прафесійнага навучання, прадастаўлення субсідыі для арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці.

Святлана БУСЬКО.

■ На хвалі быцця

ПРА ЭРУДЫЦЫЮ І НЕ ТОЛЬКІ

Нядаўна прыгадаўся адзін анекдот з часоў так званага застою. Прыносіць у чыноўніцкі кабінет падначалены сцэнарый аб правядзенні літаратурнай вечарыны па паэзіі Максіма Багдановіча. Чытае ўважліва начальнік, а потым пытаецца: «А аўтара чаму не запрасілі?».

Анекдот гэта ці быль, невядома, а вось тое, што сённяшні адзін адказны таварыш спытаў у мяне, ці трэба запрашаць для ўшанавання героя Вялікай Айчыннай вайны, аднаго з арганізатараў партызанскага руху, на сустрэчу ў гонар яго 100-гадовага юбілею, — чыстая праўда. Хаця даты нараджэння і смерці выдатнага сына Айчыны можна знайсці ў любым даведніку і тым больш у інтэрнэце.

Ужо распавядаў, што адна з выпускніц ВНУ на дзяржаўным экзамене не магла адказаць, хто такі Андрэй Макаёнак, імя якога носіць вуліца ў сталіцы, а па расповедах аднаго са знаёмых выкладчыкаў студэнт лінгвістычнага ўніверсітэта класіка беларускай літаратуры чамусьці абзываў Дуняй Марцінкевіч.

Часта па тэлевізары ва ўсялякіх гульнях накшталт «Выйграй мільён» мы бачым, як салідныя людзі — бізнесмены, «зоркі» эстрады — не могуць адказаць на пытанне, на якое ў нядаўнія часы адказаў бы любы пяцікласнік савецкай школы.

Некалі, гаворачы пра перавагі нашай адукацыі, лектары і прапагандысты прыводзілі прыклады, што амерыканскія школьнікі не ведаюць, хто такі Марк Твен, дзе знаходзіцца пустыня Сахара і г. д.

Падобна, што і мы па такіх паказчыках даганяем так званы «цывілізаваны свет». І гэта пры тым, што тэхнічны прагрэс сягнуў на небывалую вышыню.

Ivось, карыстаючыся планшэтамі і айфонамі, плэерамі і мабільнымі сродкамі сувязі, ці становімся мы, нашы дзеці, больш адукаванымі, большымі эрудытамі?

«А навошта гэта эрудыцыя? — скажаце вы. — Навошта загружаць мозг інфармацыяй, якую за пару секунд выдасць любы камп'ютар?».

Дазволю сабе паспрачацца і выказаць свае меркаванні. Веды, эрудыцыя перш за ўсё сведчаць пра агульны ўзровень чалавека, яго маральны воблік, яго інтэлектуальнае напаўненне.

І ў тым, што гэта часам не становіцца нормай, бачу прычыны многіх нашых праблем у свеце. Ды і не толькі ў свеце — у сям'і, грамадстве.

Эрудыцыя, адукаванасць — не толькі набор ведаў, гэта яшчэ і залог захавання цывілізацыі, культурных каштоўнасцяў; гэта заслон шэрасці, тупасці, дзікунства, якіх яшчэ ў нашым XXI стагоддзі, на жаль, хапае.

Мне таксама ўжо даводзілася казаць, што самыя элементарныя правілы паводзін, этэтычная выхаванасць не могуць атрымаць распаўсюджвання, калі гэтаму не надаваць пільную ўвагу з боку спецыялістаў — педагогаў, работнікаў культуры, журналістаў, тэлевядучых.

І на першым месцы пасля сям'і тут павінна стаяць школа. «Мы гаворым, што нашы дзеці не выхаваныя і пры гэтым здымаем са школьнай праграмы такі важны прадмет, як айчынная і сусветная мастацкая культура», — заўважыў падчас пасяджэння рабочай групы па ўдасканальванні навучання і выхавання школьнікаў віцэ-прэм'ер урада Анатоль Тозік, пра што паведамлялі сродкі масавай інфармацыі.

І яшчэ адзін аспект, на які апошнім часам павінна звярнуць увагу школа, — узровень навучання беларускай мове.

Неаднойчы даводзілася канстатаваць, што ў некаторых, асабліва гарадскіх школах, дзеці не атрымліваюць неабходных ведаў па прадмеце і практычна не могуць адказаць на элементарныя пытанні, што адна з дзяржаўных моў пачуваецца падчаркай падчас шматлікіх школьных мерапрыемстваў, не знаходзіць адлюстравання ў візуальным афармленні школьных памяшканняў.

І спасылка на тое, што навучальная ўстанова мае пэўны моўны рэжым навучання, не апраўдвае адсутнасці належнай увагі да мовы, якой беларускі народ вызначаўся сярод іншых славянскіх народаў, на якой створаны шэдэўры нацыянальнай культуры.

І тут да месца прагучала прапанова, выказаная падчас згаданага пасяджэння, увесці абавязковы экзамен па дзвюх дзяржаўных мовах за курс сярэдняй школы.

Безумоўна, усе гэтыя ўзаемазвязаныя праблемы не з'яўляюцца нейкім адкрыццём. Проста настаў час, калі трэба практычна больш актыўна прыйсці да іх вырашэння.

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

■ За кадрам

КУЛІНАРНЫ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ НА БЕЛАРУСКАЙ КУХНІ

Кожны тыдзень гледачы тэлеканала «Беларусь 1» маюць магчымасць здзяйсняць кулінарныя падарожжы з праграмай «Кулінарная дыпламатыя». На студыйную кухню да вядучай Ларысы Гулякевіч прыходзяць незвычайныя госці — людзі, якія выконваюць дыпламатычную місію ў Беларусі, прадстаўляючы розныя краіны. На адну з такіх сустрэч трапілі і журналісты «Звязды». Мы пазнаёміліся з аташэ па культуры Пасольства Бразіліі ў Беларусі Габрыэле Коста Гвадэнін, і разам з ёй прыгатавалі каларытную і смачную страву «Фасоля і рыс», што па-бразільску гучыць як «Фэйжон куагойс»...

Габрыэле Коста Гвадэнін здзіўлена маленькімі порцыямі ў беларускіх кавярнях.

На кухні знаходзім загадзя падрыхтаваныя прадукты, сярод якіх фасоля, рыс, вэнджаная каўбаса, сухое вэнджанае мяса, а таксама цыбуля, часнок, памідоры, бурак, морква і аліўкавы алей. Шчыра кажучы, адразу не складваецца карціны, што з такога набору можа атрымацца... Пакуль грымёр рыхтуе вядучую да эфіру, а аператары наладжваюць камеры, нам удаецца пагаварыць з гераіняй праграмы.

— Я прыехала ў Беларусь у пачатку 2013 года. Мой муж з Расіі, таму я чула пра вашу краіну, пра тое, што тут вельмі спакойна, і было жаданне прыехаць сюды, — распавядае Габрыэле Коста Гвадэнін. — Праўда, я не думала, што тут будзе так холадна, але ўсё роўна надвор'е лепшае, чым у Піцеры. Летам можна ездзіць на веласіпедзе (створаны належныя ўмовы для гэтага) альбо гуляць пешшу. Мне ў вас падабаецца жыць.

Цікаўлюся, ці з'явіліся за гэты час у спадарыні Габрыэле нейкія любімыя кавярні, рэстараны, дзе яна сустракаецца з сябрамі?

— Я рэдка бываю ў такіх установах, бо ў мяне сын маленькі. Таму мы больш любім бываць у парках ці ў нейкіх адкрытых месцах, — кажа яна. — А так я ведаю адно месца, дзе гатуюць смачныя сэндвічы. І туды мы некалькі разоў наведваліся.

— А што можаце сказаць пра адметнасці бразільскай кухні ў параўнанні з беларускай?

— Тут часта гатуюць супы, а ў нас не кожны дзень пакаштуеш гэтую страву. Можа раз на тыдзень хіба што. І хлеб з ежай у нас не ўжываюць. Мы, калі гатуем розныя стравы, то ў адну талерку накладваем пакрысе ад кожнай, а ў вас усё ў той жа салаце адразу перамешваецца. Мне падабаецца гатаваць блінчыкі, аладкі з бульбы, а сумую па нашых салатах. Бо ёсць некаторыя прадукты, якіх тут не знайсці. Але паколькі мой муж рускі, то мы гатуем часта нешта са славянскай кухні...

Ну вось і час нам ужо паглядзець на майстар-клас прыгатавання бразільскай стравы. Павітаўшыся з вядучай праграмы, Габрыэле расказвае, што гатаваць яна будзе рыс і фасолю, і ў дадатак салату са свежай агародніны. Аказваецца, такая страва ў Бразіліі з'яўляецца паўсядзённай. Засталося даведацца толькі, ці складана яе прыгатаваць.

Рыс, фасоля і салата са свежай агародніны — проста, але ж смачна!

Бярэм чырвоную фасолю, якая была замочана на ноч у вадзе, выкладваем у каструлю і ставім варыцца на вялікі агонь. Потым наразаем скрылікамі вэнджаную каўбасу (хто хоча вегетарыянскі варыянт, той можа замест каўбасы і мяса дадаць, напрыклад, гарбуз) і праз некалькі хвілін кладзем да фасолі. Тое ж самае робім і з сухім вэнджаным мясам праз нейкі час...

Бразілія наогул краіна ўнікальная — пятая па велічыні, яна лічыцца архітэктурнай жамчужынай свету. І вось на кухні мы чуем размову дзвюх жанчын пра цікавыя адметнасці гэтай дзяржавы. Аказваецца, тут вельмі любяць футбол і амаль што кожны добра разбіраецца ў гэтым відзе спорту. Карнавалы ператвараюць Рыа-дэ-Жанэйра кожны год у месца культурнага паломніцтва турыстаў з розных куткоў свету. А ўзгадаць бразільскія серыялы! Калі першыя з іх транслявалі ў нас, то многія адкладвалі ўсе справы і спяшаліся да экранаў штодня. У Бразіліі дзяржаўная мова — партугальская, што абумоўлена гісторыяй, бо адкрыў краіну партугальскі марак Пьедру Алварэш Кабрал. Тут 26 штатаў, а таксама 5 рэгіёнаў (макрарэгіёнаў), кожны з якіх мае свае адметнасці. І якраз такія прадукты, як фасоля і рыс, аб'ядноўваюць усіх бразільцаў, бо іх гатуюць паўсюль...

Габрыэле пачынае дзерці моркву, якую потым выкладвае ў каструлю з фасоляй. Затым трэба будзе падсмажыць цыбулю з часнаком на аліўкавым алеі і адначасова патушыць крыху тую сумесь, якая адварваецца.

Як расказала спадарыня аташэ, гатаваць яна вучылася, назіраючы за маці і бабуляй, якая, напрыклад, заўсёды казала: калі перамешваеш нешта, то варта рабіць гэта спакойна і акуратна. А наогул жанчына на кухні лічыць сябе аматарам і эксперыментатарам.

— У нас маленькі сын, таму гатуем так, каб было не толькі смачна, але і карысна. Не ядзім многа смажанага і салодкага, — кажа Габрыэле.

Яе пазіцыю падзяляе і вядучая праграмы, таксама мама:

— Шчыра кажучы, на кухні праводжу не шмат часу. Раніцай гатую сыну сняданак, абед. І стараюся знаходзіць такія рэцэпты, каб было хутка, смачна і карысна.

Вернемся да нашай стравы па-бразільску. Жанчыны прыступаюць да гатавання рысу. Некалькі хвілін таму на разагрэтай патэльні абсмажылі цыбулю з часнаком, а цяпер туды дадаюць сухі рыс і ўсё разам смажаць. Як аказалася, толькі пасля гэтага рыс варта адварваць у вадзе. Падыход для беларускіх гаспадынь, мне здаецца, нязвыклы, але густ — з'ява непрадказальная.

У адным з перапынкаў пацікавілася ў Ларысы Гулякевіч, ці шмат уражанняў застаецца за кадрам?

— Многае застаецца за кадрам, і кожная нацыя па-свойму раскрываецца на кухні. Па людзях адразу відаць, якія яны, калі назіраеш за іх паводзінамі падчас прыгатавання ежы. Бывалі выпадкі, калі нашы дыпламаты не ўмелі гатаваць альбо вельмі хвалявaліся, тады і кур'ёзы здараліся. Аднойчы быў выпадак, калі ў салодкую страву мы замест цукру насыпалі солі. А потым у кадры мне трэба было каштаваць гэта — было няпроста.

Наогул, калі вы паглядзіце праграму «Кулінарная дыпламатыя», то пачуеце шмат цікавага ў кожным выпуску. Напрыклад, у гэты раз мы даведаліся, што бразільскія жанчыны спяваюць і нават насвістваюць нешта на кухні, а ў нас жа думаюць, быццам такія паводзіны пазбаўляюць грошай... Таксама беларуска і бразільянка шмат гаварылі пра карнавалы, спартыўныя страсці абедзвюх краін, бразільскія ўпрыгожанні, кіно і нават візавы рэжым...

Вось абсмажаны рыс ужо варыцца ў вадзе, а фасоля перамясцілася на патэльню замест яго. Не губляючы часу вядучая і яе госця ўзяліся за прыгатаванне салаты. Надзерлі сырыя бурак і моркву і парэзалі памідор. Кожны з прадуктаў выкладваецца невялікімі горкамі на талеркі, у якіх страву будуць падаваць кожнаму на стол. І ўсё крыху паліваем аліўкавым алеем, пры жаданні пасаліўшы. Потым сюды ж накладваем фасолю і рыс. Выглядае і сапраўды каларытна, а калі пачуеце пах, то і пакаштаваць абавязкова захочацца.

Сачыце за перадачамі «Кулінарнай дыпламатыі» ў эфіры «Беларусь 1» па суботах у 11:25 і папаўняйце сваю скарбонку новымі стравамі, адкрывайце новыя імёны і краіны. А яшчэ абавязкова дзяліцеся вынікамі ўласных эксперыментаў на кухні з роднымі — за сняданкам, абедам альбо вячэрай...

Алена ДРАПКО

Бразільскія жарсці кіпяць на беларускай кухні.

Фота Надзеі БУЖАН.

■ Тэлесеткі

БАРАБУЛЬКА З ТКЕМАЛІ

І іншыя прыгоды турыстаў на «Беларусь 2»

2 лістапада тэлеканал прадставіць прэм'еру новага праекта «Турыст» — сумеснай працы Белтэлерадыёкампаніі і Грамадскага Аджарскага тэлебачання (Грузія). Цягам сямі тыдняў гэта рэаліці-шоу будзе распавядаць пра падарожжа грузінскага тэлежурналіста па Беларусі, а яго беларускага калегі — па Грузіі.

У нашу краіну для здымак прылятаў і тыдзень праходзіў па вельмі насычаных турыстычных маршрутах спецыяльны карэспандэнт Аджарскага тэлебачання Бесі Чыбурданідзэ. А прадстаўнік Белтэлерадыёкампаніі, тэлевядучы Дзяніс Дудзінскі, які апошнім часам рэалізуе сваю даўнюю мару — актыўна падарожнічае па свеце, пад пільным вокам камер аджарскіх тэлевізійнікаў вандраваў па Грузіі. Папярэдне абодва вядучыя пазнаёміліся праз інтэрнэт і абмяняліся пэўнай інфармацыяй пра свае краіны, але ж, зразумела, лепш адзін раз убачыць...

Калі: 2 лістапада ў 12.20.
Дзе: «Беларусь 2».

Бесі, напрыклад, літаральна трапіў з карабля на баль: «Замест ранішняй зарадкі мы падрыхтавалі для госця пад'ём на Курган Славы, пасля абеду яго чакала прагулка па старым горадзе — гістарычным цэнтры Мінска, а «на закуску» мы пакінулі экскурсію па Нацыянальнай бібліятэцы, — расказваюць аўтары праекта «Турыст». — Дарэчы, знаёмства грузінскага журналіста з дранікамі прайшло «на ўра». Таксама ў планах госця — візіт у аквапарк і на рыцарскі фэст, культурная праграма ў самых вядомых беларускіх тэатрах і больш шчыльнае знаёмства з нацыянальнай кухняй, а сярод асабістых пажаданняў — прафесійны інтарэс спартыўнага карэспандэнта да пляцовак «Мінск-Арэна» і «Барысаў-Арэна». «Як я не валодаў раней дастатковай колькасцю інфармацыі аб сучаснай Беларусі, гэтаксама яе не маюць і грамадзяне Грузіі, — разважае Бесі Чыбурданідзэ. — Я хачу расказаць ім, што можна без праблем прыехаць у Беларусь, як у любую іншую еўрапейскую краіну, і выдатна адпачыць тут!»

Дзяніс жа тым часам убачыў Батумі з вышыні птушынага палёту, праінспектаваў улоў стаўрыды, падняўся па канатнай дарозе на гару Ферыя і памачыў ногі ў Чорным моры, а таксама пазнаёміўся з мясцовымі гастранамічнымі традыцыямі — прадэгуставаў барабульку з ткемалі і чачай. І ўсё гэта — літаральна за адзін дзень!

Сваімі ўражаннямі і адчуваннямі, наколькі блізкія ці далёкія нашы краіны, тэлевядучыя будуць дзяліцца з гледачамі ў кожным выпуску праекта, гартаючы старонкі своеасаблівага відэачасопіса пра падарожжа...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

Прусак з цвыркуном ды асёл мыла з'елі

Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь-3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт http://tvrgomel.by або http://3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Папярэдне ж праверыць сваё веданне роднай мовы можна з дапамогай «Звязды».

Ці ведалі вы, што:

✓ **Цвыркун** — насякомае, якое трэннем крыл утварае стракатанне.

✓ **Разынкі** — сушаныя ягады вінограду. Беларусы ўзялі слова «разынкі» з Еўропы, а прыйшло яно да нас у часы Вялікага Княства Літоўскага.

✓ **Прусак** — рыжы таракан.

✓ **Ядловец** — вечназялёны куст з чорна-сінімі пладамі. У даўнія часы ядловец у народзе лічылі добрай засцярогай ад уздзеяння чорта на чалавека.

✓ **Камізэлька** — кароткая адзежына без рукавоў і каўняра.

✓ **Каліва** — асобна ўзятая расліна, сцябліна, саломіна; самая малая колькасць чаго-небудзь.

✓ **Асёл маляваны.** Так кажуць пра неразумнага чалавека, дурня. Па руску — «олух царя небесного», «голова пустая». Беларускія сіноніімы — «вецер у галаве», «пудзіла агароднае». Раней у вандроўных цырках асла размалёўвалі для пацехі публікі, але гэта не змяняла ні характару, ні ўпартасці «цыркача» — асёл заставаўся аслом, і ніякія фарбы не дапамагалі яму змяніцца.

✓ **Як мыла з'еўшы.** Азначае — з незадаволеным тварам, выглядам. Рускі аналаг — «с кислой миной», «как лимон проглотил». Па-беларуску яшчэ кажуць у такім выпадку — «крывіць губы». На самой справе, тут размова ідзе хутчэй не пра мыла, а пра мыльную траву. У ветэрынарных даведніках адзначана, што калі карова з'есць такога «мыла», то становіцца вялай і прыгнечанай.

Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» ***кожную суботу ў 11.10–11.25.***

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

■ Запрашальнік

І Дэміс — такі малады!

Славуты спявак развітаецца з каханнем

Адбудзецца гэта, бадай, у пяцісотый раз. Аднак упершыню — у суправаджэнні Прэзідэнцкага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Віктара Бабарыкіна. Музычная легенда Еўропы выступіць у Мінску 16 снежня — з праграмай «Вечар настальгіі».

У беларускай сталіцы артыст збіраецца выканаць не толькі любімыя песні розных гадоў у суправаджэнні аркестра, але і падзяліцца ўспамінамі пра пэўныя эпізоды свайго багатага на самыя розныя выпадкі жыцця. Панастальгіраваць разам з Дэмісам Русасам арганізатары канцэрта запрашаюць гледачоў у Палац Рэспублікі. Кошт квіткоў — ад 350 тысяч да 1,5 мільёна беларускіх рублёў, але ж для многіх успаміны маладосці — рэч наогул бясцэнная…

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ПАНЯДЗЕЛАК, 3 ЛІСТАПАДА

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 0.00 Зона Х.
9.10 Галоўны эфір.
10.05 Клуб рэдактараў.
10.45 «Зорнае жыццё». «Вечнае каханне».
11.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
12.10 Камедыя «Старыя-разбойнікі».
13.50, 15.55 Меладрама «Цяжарная бабуля». 1-я і 2-я серыі.
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
17.30 Беларуская часінка.
19.20 Арэна.
20.00 Форум.
21.00 Панарама.
21.45 Серыял «След».
23.40 Актуальнае інтэрв'ю.
0.40 Дзень спорту.
0.50 Меладрама «Белая сукенка».

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.00, 10.05, 21.30 Тэлебарометр.
9.05, 16.40 Серыял «Сашка».
10.35 Пад грыфам «Вядомыя».
11.15 Дэтэктыў «Разумнік».
13.10 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».
15.30 «Comedy Батл. Без межаў».
17.50, 23.50 Серыял «Таксі».
18.50 Серыял «Універ».
20.55 Рэальны свет.
21.25 КЕНО.
21.35 Серыял «Віртуозы».
22.45 Баявік «Кулінар-2».
23.45 Хачу ў тэлевізар!
0.25 «Халі-галі».

БЕЛАРУСЬ 3

7.05 «Дабраранак».
7.40 «Хачу ўсё ведаць!».
7.50, 13.25, 19.15, 0.45 «Калейдаскоп».
8.05, 17.25 «Дыя@блог P.S.».
8.30 Сусветнае кіно. «Бэкет».
10.50 «Незвычайныя прыгоды Дзяніса Караблёва». Маст. фільм. 1-я і 2-я серыі.
13.00 «Старыя казкі». Гісторыя стварэння цыкла дзіцячых фільмаў паводле «Дзяніскіных апавяданняў» Віктара Драгунскага.
13.40 «Аляксандр Пархоменка». Маст. фільм.
15.25 «Камертон». Спявачка і актрыса Яўгенія Смальянінава.
15.50 «Я — часовы вандроўнік. Якуб Колас. Паэт і чалавек». Дак. фільм.
16.20, 23.35 «Новая зямля». Маст. фільм. 1-я серыя.
17.50 «Чужая бацькаўшчына». Маст. фільм.
19.30 «Правадыр — Белае Пяро». Маст. фільм.
20.45 «Калыханка».
21.10 Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
22.05 «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
22.30 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
23.00 «Подых струн». Музычная праграма.

БЕЛАРУСЬ 5

7.00 PRO спорт. Навіны.
8.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Манчэстэр Юнайтэд».
9.55 Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Металург» (Новакузнецк).
11.45 Гандбол. ЧЕ-2016. Кваліфікацыя. Мужчыны. Літва — Беларусь.
13.15 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Астан Віла» — «Тотэнхэм».
15.10 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэасапіс.
15.40 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Арсенал» — «Бернлі».
17.30 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ньюкасл» — «Ліверпуль».
19.25 Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Мінск) — БАТЭ (Барысаў).
21.15 Час футбола.
22.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
22.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Крыстал Пэлас» — «Сандэрленд».

АНТ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.20, 11.10 Маст. фільм «Справа была ў Пянькове».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
12.15, 13.10 Камедыя «Палаcаты рэйс».
14.00 Маст. фільм «Паклонніца».
16.15 «Лермантаў».
18.20 «Адваротны адлік. «8 мм. Паралельнае кіно».
19.00 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 «Справа прынцыпу».
Амерыканскаму кінаакцёру і майстру баявых мастацтваў Чаку Норысу споўнілася ўжо 74 гады. Аднак паважаны ўзрост не перашкаджае «крутому Уокеру» па-ранейшаму здымацца ў касавых фільмах і знаходзіцца ў выдатнай фізічнай форме. Тое, што кажуць і пішуць у СМІ пра Чака Норыса, далёка не заўсёды з'яўляецца праўдай. Мы прапануем вам пазнаёміцца з абсалютна дакладнымі фактамі з біяграфіі акцёра.

Яго сапраўднае імя не Чак і нават не Чарльз, а Карлас Рэй Норыс. Яго дзед быў чыстакроўным ірландцам, а маці паходзіла з індзейцаў чарокі.

З 1968 года Чак Норыс не прайграў ніводнага бою. Усе дзесяць яго апаненцаў адбыліся раней. Усяго на рахунку Норыса 168 перамог і 2 нічыі.

Чак Норыс стаў першым чалавекам з Захаду, які заслужыў чорны пояс 8 ступені за майстэрства ў тэквандо. У дадатак да гэтага ён з'яўляецца ўладальнікам чорнага пояса па дзюдо, бразільскім джыу-джытсу і тансудо.

Падчас службы ў ВПС ЗША Чак быў паветраным паліцэйскім. Яго знаёмства з баявымі мастацтвамі пачалося падчас службы ў Паўднёвай Карэі. Пазней ён таксама быў абраны ганаровым марскім і тэхасскім рэйнджарам.

Норыс з'яўляецца персанажам анлайн-гульні World of Warcraft.

Чак Норыс рэкламаваў мадэль джынсаў пад назвай Action Jeans. Дызайн і крой іх дазваляе з лёгкасцю рухацца і рабіць удар з разваротам без асцярогі іх разарваць.

Чак кожны дзень пачынае з паходу ў спартзалу.

Норыс з'яўляецца заснавальнікам арганізацыі KickStart Foundation, якая заклікае падлеткаў займацца каратэ ў школах і тым самым засцерагае іх ад наркотыкаў; United Fighting Arts Federation, якая аб'ядноўвае тых, хто вывучае Chun-Kuk-Do — уласны стыль Норыса, а таксама World Combat League.

Чак напісаў некалькі кніг і нават стаў самым прадаваным аўтарам па версіі «Нью-Ёрк Таймс». Тры з сямі кніг сталі бестселерамі, а менавіта: «Чорны пояс. Патрыятызм: як абудзіць Амерыку», аўтабіяграфія «Нягледзячы на ўсе цяжкасці», і мастацкія творы «Вершнікі правасуддзя» і «Пагроза справядлівасці».

У Рунэце з нагоды стабільнай непераможнасці Чака ў кіно (яго герой ніколі не гіне) і ў жыцці (што ёсць, тое ёсць) ходзіць мноства іранічных і смешных фраз і інтэрнэт-мемаў. Прывядзём некаторыя з іх:

Чак Норыс у дзяцінстве спаў з сапраўдным мядзведзем.

Чак Норыс палічыў да бясконцасці. Двойчы.

Чак Норыс вынайшаў усе колеры, акрамя ружовага. Ружовы колер вынайшаў Том Круз.

За барадой Чака Норыса няма падбародка: там яшчэ адзін кулак.

«Колькі адцісканняў робіць Чак Норыс?» — «Усе».

Слёзы Чака Норыса лечаць ад раку. На жаль, Чак Норыс ніколі не плакаў.

Чак Норыс карыстаецца начніком не таму, што баіцца цемры, а таму, што цемра баіцца Чака Норыса.

Зброі масавага паражэння не існуе. Ёсць толькі Чак Норыс.

Навукоўцы высветлілі, што энергія, якая вылучылася пры Вялікім выбуху, прыкладна роўная 1 УЧННР (Удар Чака Норыса Нагой з Развароту).

ПЯТНІЦА, 7 ЛІСТАПАДА

БЕЛАРУСЬ 1

7.05 Камедыя «Не можа быць!».
8.50, 16.55 Камедыя «Сабака Барбос і незвычайны крос».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10, 17.05 Камедыя «Самагоншчыкі».
9.35 Прыгоды «Няўлоўныя мсціўцы».

11.00 Прыгоды «Новыя прыгоды няўлоўных».
12.55, 14.15 Прыгоды «Карона Расійскай імперыі, або Зноў няўлоўныя». 1-я і 2-я серыі.
15.15 Навіны рэгіёна.
16.10 Нашы.
16.25 «Вялікі рэпартаж».
17.30 Камедыя «Канікулы строгага рэжыму». 1-я — 3-я серыі.
21.00 Панарама.
21.45 Серыял «Забыты». 1-я — 4-я серыі.
1.45 «Беларусь у развіцці».
2.15 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.05, 21.20 Тэлебарометр.
9.10 Серыял «Гардэмарыны, наперад!». 1-я — 4-я серыі.
14.40 Серыял «Універ».
16.55 Анімацыйны фільм «Рухай ластамі-2».
18.55 Баявік «Хуткасць».



21.00 «На прыродзе».
21.25 КЕНО.
21.30 «Бітва экстрасэнсаў».
23.00 Рэпарцёр.
23.55 Серыял «Гардэмарыны, наперад!». 1-я серыя.

БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 14.30, 18.50, 23.10 «Калейдаскоп».
8.15, 10.20, 12.00 «Блуканне па пакутах». Маст. фільм. Часткі 1-я — 3-я.
9.55, 17.35 «Дыя@блог». «Правечнае».
13.35, 15.40, 19.05 «Размаўляем па-беларуску».
13.40 «Без эпітафіі». Дак. фільм.
14.45 «Аўтограф». «Патрыярх танца». Аляксандр Рыбальчанка — кіраўнік ансамбля народнага танца.
15.15 М/ф «Аповесць мінулых гадоў». Часткі 1-я — 3-я.
15.45 «Музеі Беларусі». Дзяржаўны музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь.
16.10 «Мы з Кранштата». Маст. фільм.
18.00 «Я прыйду...» Вечар памяці Віктара Вуячыча.
19.10 «Аршын Мал Алан». Маст. фільм.
20.45 Калыханка.
21.00 Сусветнае кіно. «Камісар».
22.40 «Камертон». Джазавы гітарыст, народны артыст Расіі Аляксей Кузняцоў.

БЕЛАРУСЬ 5

7.00 PRO спорт. Навіны.
8.00 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Цюрых» (Швейцарыя) — «Вільярэал» (Іспанія).
9.50 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Генгам» (Францыя) — «Дынама» (Мінск, Беларусь).
11.40 Авертайм.
12.05, 21.30 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд тура.
12.55, 19.05 Хакей. КХЛ. «Адмірал» (Уладзівасток) — «Дынама» (Мінск).
15.15 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Вольфсбург» (Германія) — «Краснадар» (Расія).
17.10 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Дынама» (Масква) — «Эштарыл» (Партугалія).
21.00 Фактар сілы.
22.25 Рэаліці-шоу «Mix Fight. Новыя гарызонты».
23.10 Еўрапейскі покерны тур.

АНТ

7.00 «Наша раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 «Жыць здорава!».
10.25 «Харошкі. 40 гадоў». Юбілейны канцэрт.
11.40 «Рыгор Распуцін. Ахвярапрынашэнне».
12.40, 16.20 Серыял «Рыгор Р.».
16.15, 21.00 Навіны спорту.
20.00 «Калі ты ў бяспецы».
21.05 «Чорна-белае».
22.10 «Голас».
0.15 «Вячэрні Мінск».
1.20 Начныя навіны.

СТБ

6.25 Маст. фільм «Практычная магія».
8.15, 12.50, 20.00 «Гарады, якія спяваюць». Дзённік. Мінская вобласць.
8.20 «Прывітанне, доктар».
8.55 «Аўтапанарама».
9.20, 17.40 «Званая вячэра».
10.20 Маст. фільм «ДОстояние Республики». 1-я і 2-я серыі.
12.55, 16.40 «Легенды СССР».
13.55 Маст. фільм «Пакроўскія вароты». 1-я і 2-я серыі.
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
18.40 «Такі лёс».
20.05 Маст. фільм «Прэстыж».

22.30 «На тым жа месцы ў той жа час».
23.50 «Вялікая гульня». Покер-дуэль.
0.35 «Легенды Рэтра FM».

МІР

6.00 «180 хвілін».
8.45 «Сардэчна запрашаем».
9.10 Маст. фільм «Мы з джаза».
10.30 Маст. фільм «Люблю, таму што люблю».
12.10, 5.05 Серыял «У свеце ежы».
13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
13.15, 2.20 Серыял «Дарогі Індыі».
15.05, 3.55 Серыял «Тайныя знакі».
16.20 «Злачынства і пакаранне».
16.45 «Сакрэтныя матэрыялы».
17.10 Серыял «Гадзіннік кахання».
19.20 Серыял «Адзін на ўсіх».
22.45 Маст. фільм «Аб бедным гусары закіньце слова».
1.45 Ток-шоу «Яшчэ не разам».
4.50 «Прыгоды Македонскай».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.00 «Забыты правадыр. Аляксандр Керанскі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.40 «Прамы эфір».
13.00 «Асаблівы выпадак».
14.30 Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
15.30 «Узыход Перамогі. Разгром германскіх саюзнікаў».
16.30 «Мая планета».
17.15 «Уся Расія».
17.50 Серыял «Сэрца зоркі».
18.50 Серыял «Пакуль станіца спіць».
19.45 «Факты».
21.00 Серыял «Каменская».
22.00 Серыял «Пошукі доказаў».
23.50 Да 200-годдзя з дня нараджэння Міхаіла Лермантава. Урачысты вечар у Вялікім тэатры.

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.10 «Да суда».
9.10, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».
11.25, 17.30 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
11.55, 13.25 «Суд прысяжных».
14.35 «Справа густу».
15.00, 16.35 Серыял «Ляснік».
17.55 Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
19.50 Серыял «Ліцейны».
23.30 Серыял «Прачнёмся разам?».

8 КАНАЛ

7.00, 12.05, 19.10, 21.00, 23.55 «Надвор'е».
7.05, 16.15 Мультпарад.
7.30, 19.15 Серыял «Грэйсленд».
9.00, 17.45 «Навіны».
9.10, 18.55 «Тэлемагазін».
9.30, 17.55 Серыял «Смерць у раі».
10.25 Драма «Служылі два таварышы».
12.10 «TUT BY прадстаўляе» «Джаз».
12.50 Серыял «Ад'ютант яго правасхадзіцельства».
14.05 Серыял «Кузей Гюней».
16.30 «Адшукваецца адпачынак».
17.00 Серыял «Эўрыка».
20.50 «Вечарніца».
21.05 Баявік «Каардынаты Скайфал».

23.30 Серыял «Незямны сёрфінг».

ВТВ

6.00, 5.00 «PLAY».
8.30 М/ф «Смяшарыкі».
9.00 Скетч-шоу «Асцярожна, дзеці!».
9.30 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
10.00, 0.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
10.30, 4.30 «Лаві момант».
11.00 Прыгоды «Тайна Мунакра».
13.15 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.00 «Зорныя гісторыі. Зоркі 90-х».
15.00 Меладрама «Пенелопа».
17.15, 1.00 «Уральскія пельмені».
21.30 Трылер «Закладнік».
0.00 «Дурні і дарогі».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.00, 23.10 Навіны культуры.
10.20 Шэдэўры старога кіно. Маст. фільм «Свята святога Іаргена».
12.00, 2.40 «Сусветныя скарбы культуры».
12.15 «Правілы жыцця».
12.45 «Пісьмы з правінцыі».
13.15 Маст. фільм «Талісман».

14.20 Дак. фільм «Міхаіл Ларыёнаў. Калі ўзыходзіць паўночнае сонца».
15.10 «Хто мы?». «Першая сусветная».
15.40 Білет у Вялікі.
16.25 Дак. фільм «Леў Зільбер. Паляванне на вірусы».
17.10 Вялікая опера.
19.15 Смеханастальгія.
19.45 Дак. фільм «Чырвоны Эрмітаж».
20.30 Серыял «Нікаля Ле Фрок. Чалавек са свінцовым чэравам». 1-я серыя.
22.15 «Лінія жыцця». Фабіа Мастранджэла.
23.30 Маст. фільм «Тусен Луверцюр». 2-я серыя.
1.05 Джымі Хендрыкс на фестывалі ў Мантэрэе.
1.55 «Шукальнікі». «Магічныя пярсцёнкі Пушкіна».

НАСТАЛЬГІЯ

6.00 «Блакітны агеньчык» ад 7 лістапада 1970 года.
6.45 «Поле цудаў». 1991 год.
7.25 Фільм-спектакль М. Жванецкага «Птушыны палёт».
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час».
10.00, 16.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
11.00 Фільм-канцэрт «Спявае Джо Дасэн».
12.00 Ваенны парад і дэманстрацыя працоўных 7 лістапада 1974 года.
13.00 «Праграма «А». 1990 год.
13.55, 19.30 Тэлеспектакль «Ноч памылак».
17.00 «Песня-77».
18.00 «Музычны рынг». 1-ы раўнд. 1989 год.
18.50 Фільм-канцэрт «Спявае Дзін Рыд».
20.30, 2.35 Канцэрт замежнай эстрады.
22.00 «Колба часу».
23.00 «Погляд» ад 25 лістапада 1988 года. 1-я частка.
0.00 «Яловая субмарына». Гісторыя рускага рока.
1.00 «Каханне з першага погляду». 1992 год.
1.30 Маст. фільм «Бумбараш». 2-я серыя.
5.00 «Песня-76».

EUROSPORT

10.30, 12.15, 15.30, 18.00, 0.30 WATTS.
11.30 Футбол. «Рэал Мадрыд» (Іспанія) — «Ліверпуль» (Англія).
13.30, 1.30 Тэніс. Турнір Вялікага шлема. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Фінал. Мужчыны.
16.00 Снукер. Міжнародны чэмпіянат. Фінал.
19.00, 23.00 Наймацнейшыя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў.
20.00 Тэніс. Турнір Вялікага шлема. Адкрытае першынства Аўстраліі. Фінал. Мужчыны.
22.00 Бокс.
0.00 Цімберспортс. Прыз чэмпіёнаў.
0.45 Аўта- і мотаспорт.
1.00 Ралі. ERC.

КАМЕДЫЯ

6.00, 10.00, 14.30, 17.30, 22.00, 3.10 Серыял «Сваты 3».
6.55 Камедыя «Маё вялікае грэчаскае лета».
8.30 Камедыя «Татулі».
10.55 Камедыя «Заняпад мужчынскай імперыі».
12.30, 20.00, 22.50, 2.50, 5.45 Скетчком «Паміж намі».
12.45 Камедыя «Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу».
15.25 Камедыя «Усмешка Бога, ці Чыста адэская гісторыя».
18.20 Камедыя «Парода бульдог».
20.20 Камедыя «Помста пушыстых».
23.10 Камедыя «Двое — гэта занадта».

1.15 Камедыя «Нядрэнна б пахудзець».
4.05 Камедыя «Банда няўдачнікаў».

ТБ3

6.00 М/ф.
10.45 «Паненка і кулінар».
11.15 Дак. серыял «Папялушкі савецкага кіно».
12.00, 14.30, 1.00, 3.20 Маст. фільм «Сэрцы траіх».
14.00, 2.50 «Тайны нашага кіно. «Сэрцы траіх».
17.30 Дак. фільм «Бляск і галеча савецкіх манекеншчыц».
18.20 Маст. фільм «Летуценнік».
20.10 Камедыя «Так яна знайшла мяне».
22.00 «Зорныя гісторыі».
23.00 «Гісторыі выратавання».
23.30 Дак. фільм «Фарцоўшчыкі — небяспечная справа».

ТБ1000

6.10, 15.50 Драма «Сем жыццяў».
8.20, 14.10 Меладрама «Даверся сябрам».
10.10 Камедыя «Рэальнасць кусаецца».
12.00 Драма «На дарозе».



18.00 Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
20.00, 3.45 Драма «Праз Сусвет».
22.20 Камедыя «Вампіркі».
0.00 Баявік «Каралі Дагтаўна».
1.55 Камедыя «Сур'ёзны чалавек».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Камедыя «Тарыф Навагодні».
8.05 Трагікамедыя «Зусім не простая гісторыя».
10.05 Драма «Мелодыя для катрынкі».
12.45 Камедыя «Жаніцьба».
14.30 Трылер «Апошні уікэнд».
16.10 Драма «Бедны, бедны Павел».
18.00 Баявік «Бой з ценем».
20.20 Баявік «Бой з ценем: Рэванш».
22.40 Баявік «Бой з ценем 3D: Апошні раўнд».
0.50 Драма «Злачынства і пакаранне».
3.00 Меладрама «Восеньскія клопаты».
4.40 Казка «Як Іванка-дурань па цуд хадзіў».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Супердабудаванні Трэцяга рэйха.
7.00, 13.00 Гульні розуму.
7.30, 13.30 Займальная навука.
8.00 Зрабі або памры.
8.30 Навуковыя недарэчнасці.
9.00, 14.00 Дзікі тунец.
10.00, 15.00, 20.00 Золата Юкана.
11.00 Мегазаводы.
12.00 Цяжкае золата Аляскі.
16.00 Кракадзілы Катумы.
17.00 Тайны гуансійскіх пячор.
18.00 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
19.00 Экстрэмальныя даследчыкі.
21.00, 1.00, 4.00 Уварванне на Зямлю.
22.00, 2.00, 5.00 Эвакуацыя Зямлі.
23.00 Расследаванні авіякатастроф.
0.00 Мяжа.
3.00 Дзень «Д».

DISCOVERY

8.00, 10.35 Залатая ліхаманка.
8.50 Аўтальянцы.
9.40, 14.15, 21.35 Як гэта ўстроена?
10.10, 14.40, 21.05, 5.45 Як гэта зроблена?
11.30, 6.10 Магія Бена Эрла.
12.25, 17.25 Ліквідатар.
13.20, 1.55 Top Gear.
15.10, 4.55 Акулы аўтатаргоў з Даласа.
16.05, 7.05 Махінатары.
18.20 На вышыні хмарачосаў.
19.15 Смяротны ўлоў.
20.10 Тыкль.
22.00 Паўстанне машын.
23.00 Як уладкаваны Сусвет.
0.00 Звышчалавечая навука.
1.00, 4.05 Каралі аўкцыёнаў.
2.50 Сапраўдныя аферысты.
3.40 Маланкавыя катастрофы.

СУБОТА, 8 ЛІСТАПАДА

БЕЛАРУСЬ 1

6.40 Існасць.
7.05 Серыял «Забыты». 1-я і 2-я серыі.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Клуб рэдактараў.
9.45, 23.40 Серыял «Байкі Міцяя». 1-я і 2-я серыі.
10.55 «Пра ежу!».
11.25 Кулінарная дыпламатыя.
12.10 Гісторыі рамонту.
12.50 Ток-шоу «Здароўе».
13.30 БеларусьLIFE.
13.55 «Terra incognita». Беларусь невядомая.
14.25 XXI Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад-2014».
15.15 Навіны рэгіёна.
15.30 «Беларусь у развіцці».
16.00, 1.00 «Вялікая розніца».
17.05 Драма «Трэцяя сусветная». 1-я — 4-я серыі.
21.00 Панарама.
21.40 Меладрама «Сэрца без замка».
0.50 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

6.55 Маст. фільм «Варвара краса — доўгая каса».
8.25 М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
9.45 Беларуская кухня.
10.20, 21.05 Тэлебарометр.
10.25 Капейка ў капейку.
11.00, 21.45 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».
12.35 «Бітва экстрасэнсаў».
14.10 Вось гэта дзіва!
14.45 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».
17.15 «Comedy woman».
18.25 Ікра.
19.15 Ваша лато.
19.55 Латарэя «Пяцёрачка».
20.05 «Сустрэча з...».
20.40 Кіпень.
21.00 КЕНО.
21.10 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА.
23.15 Серыял «Гардэмарыны, наперад!». 2-я серыя.
0.40 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА.

БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 12.20, 16.10, 0.10 «Калейдаскоп».
8.15 «Аршын Мал Алан». Маст. фільм.
9.45 «Камертон». Джазавы гітарыст, народны артыст Расіі Аляксей Кузняцоў.
10.10 «Легенды кіно». Гісторыя стварэння фільма «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях».
10.25 «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях». Маст. фільм.
11.55 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
12.35 «Казкі старога чараўніка». Маст. фільм. 1-я і 2-я серыі.
14.50 «Браты па крыві». Маст. фільм.
16.25 «Музеі Беларусі». Гісторыка-культурны комплекс «Лінія Сталіна».
16.50 «Песня мая». Канцэрт Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2014».
17.45 «Дыя@блог P.S.».
18.10 Серыял «Робін з Шэрвуда».
20.45 Калыханка.
21.10 Сусветнае кіно. «Дракула Брэма Стокера».
23.10 «Уладзімір Гасцюхін. Пагружэнне». Дак. фільм.

БЕЛАРУСЬ 5

8.00 PRO спорт. Навіны.
9.00 Рэаліці-шоу «Mix Fight. Новыя гарызонты».
9.45 Фактар сілы.
10.15 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд тура.
11.10 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
11.40 Хакей. КХЛ. «Адмірал» (Уладзівасток) — «Дынама» (Мінск).
13.35 Тэніс. Турнір ВТА. Выніковы турнір. Фінал.
15.40 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Чэлсі».
17.55 Гандбол. SEHA-ліга. «БГК ім. Мяшкова» (Беларусь) — «Вардар» (Македонія).
19.35 Еўрапейскі покерны тур.
20.25 Футбол. Чэмпіянат Англіі. КПР — «Манчэстэр Сіці».
22.30 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Юнайтэд» — «Крыстал Пэлас».

АНТ

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 «Смяшарыкі». Новыя прыгоды.
9.20 «Здароўе».
10.25 «Смак».
11.05 «Ідэальны рамонт».
12.05 «Разумніцы і разумнікі».
12.50 «Бацькоў у школу!».
13.45 «У наш час».
15.15 «Рассмяшы коміка».
16.15 Навіны спорту.
16.20, 21.00 «Вялікія гонкі».
17.50 «100 мільёнаў».
18.45 «Сёння вечарам».
21.05 «Хачу да Меладзэ».
23.05 Драма «Мулан».
1.05 Маст. фільм «Мастак-злодзей».

СТБ

6.00 Серыял «Студэнты 2».
7.25 «Анфас».
7.40 Маст. фільм «Прэстыж».
9.55, 13.40 «Гарады, якія спяваюць». Дзённік. Мінская вобласць.
10.00 «Чыстая праца».
10.55 «Гэта мой дом».
11.30 «Мінск і мінчане».
12.05 «Прыгоды дылетанта».
12.40 «Сакрэтныя тэрыторыі».
13.45 Маст. фільм «Вяртанне рэзідэнта». 1-я серыя.
15.10 «Ваенная тайна».
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.45 «Наша справа».
17.00 «Вялікі горад».
17.35 «Дзіўная справа».
18.25 «Разумней не прыдумаеш».
20.00 «СТВ-спорт».
20.10 «Гарады, якія спяваюць». Кастынг-шоу. Мінская вобласць.
22.00 «Вялікія тайны»: «Энергія старажытных Багоў».
23.00 «Зорны рынг. Бітва хітоў». Група «Sheldon Cooper» супраць групы «Uncle Bands».
0.15 Маст. фільм «Рок-нрольшчык».

МІР

6.00, 8.35 М/ф.
7.45 «Зямля і неба».
8.10 «Саюзнікі».
9.15 «Эксперыментатары».
9.30 «Ой, мамачкі».
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 «Любімыя акцёры».
10.40 Маст. фільм «Аб бедным гусары закіньце слова».
13.40 Канцэрт Марыны Дзявятавай.
16.15 Серыял «Жыць спачатку».
23.30 Маст. фільм «Знахар».
1.50 Серыял «Прывалаўскія мільёны».
4.45 Маст. фільм «Падкідыш».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 Маст. фільм «Гамлет Шчыгроўскага павета».
8.35 Маст. фільм «Загадана ажаніць».
10.35 М/ф «Маша і мядзведзь».
11.00, 14.00 Весткі.
11.10 «Суботнік».
11.50 «Планета сабак».
12.20 Маст. фільм «Дапушчальныя ахвяры».
14.15 Серыял «Мора па калена».
16.05 «Мая планета». «Майстры». Каменярэз.
16.40 «Уся Расія».
17.10 «Суботні вечар».
19.00 «Карціна свету».
19.55 Надвор'е на тыдзень.
20.00 Весткі ў суботу.
20.45 Маст. фільм «У чаканні вясны».
22.35 Маст. фільм «Сон як жыццё».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.05 Маст. фільм «Целаахоўнік».
6.55, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.50 «Урачэбныя тайны плюс».
9.25 «Справа густу».
10.20 «Галоўная дарога».
10.55 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.25 Ток-шоу «ДНК».
14.20 «Я худзею».
15.25 «Паедзем, паядзім!».
16.20 «Вочная стаўка».
17.05 «Кантрольны званок».
18.05 «Следства вялі...».
19.00 «Цэнтральнае тэлебачанне».
20.05 «Новыя рускія сенсацыі».
21.10 Маст. фільм «Танец жывата».
22.55 «Жыццё як песня. Таццяна Буланава».
23.55 «Спіс Норкіна».

8 КАНАЛ

9.00, 13.30, 19.00, 21.00, 23.40 «Надвор'е».
9.05 Мультпарад.
9.35 Серыял «Грэйсленд».
11.00 «Даведнік па краінах і кантынентах».
11.10 Драма «Маанзунд».
13.35 Камедыя «Д'ябал носіць Prada».
15.20, 23.30 «Кінаблакнот».
15.30 «Тэлемагазін».
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
16.30 Камедыя «Вяселле ў Малінаўцы».
18.10 Серыял «Эўрыка».
19.05 Камедыя «Каханне з акцэнтам».
20.50 «Вечарніца».
21.05 «Фэшн is my прафэшн».
21.15 Драма «Джоні Д».

ВТВ

6.00, 5.00 «PLAY».
8.30 М/ф «Смяшарыкі».
9.00 Серыял «Татавы дочкі».
10.00, 2.00 «Турба міксер».
12.00 «Сябры па кухні».
12.30 Серыял «Каралёк — птушка пеўчая».
15.00 Прыгоды «Тайна Мунакра».
17.15, 23.15 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
17.30 «Уральскія пельмені».
19.00 Серыял «Васьмідзясятыя». Новы сезон.
20.30 Фантастыка «Знак».
23.30 «Ленінградскі Stand-up клуб».
0.30 «Лаві момант».
1.00 «Нерэальная гісторыя».
1.30 «Людзі Хэ».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00 Біблейскі сюжэт.
10.35 Да 70-годдзя з дня нараджэння рэжысёра. Маст. фільм «Талісман».
11.35 Пернікавы домік. «Рускі лубок».
12.05 Вялікая сям'я. Алег Меньшыкаў.
12.55 Дак. фільм «Чырвоны Эрмітаж».
13.40 «Больш, чым каханне». Анатоль Луначарскі і Наталля Разенэль.
14.20 Да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны «Нефрантавыя нататкі».
14.50 Спектакль Малога драматычнага тэатра. «Маскоўскі хор».
17.25, 1.55 Дак. фільм «Джаглавак — прынц насякомых».
18.20 85 гадоў з дня нараджэння Алега Барысава. «Я акцёр і ніхто іншы...». Вечар-прысвячэнне ў МХТ імя А.П. Чэхава.
19.25 Маст. фільм «Па галоўнай вуліцы з аркестрам».
21.00 «Вялікая опера».
22.40 «Белая студыя».
23.25 Кіно на ўсе часы. Маст. фільм «Сапраўдныя каштоўнасці».
1.30 М/ф для дарослых «Вяртанне з Алімпа».
2.50 Дак. фільм «О. Генры».

НАСТАЛЬГІЯ

6.00 Ваенны парад і дэманстрацыя працоўных 7 лістапада 1974 года.
7.00 «Праграма «А». 1990 год.
7.55, 13.30 Тэлеспектакль «Ноч памылак».
9.00, 15.00, 3.00 «Мінулы час».
10.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
11.00 «Песня-77».
12.00, 18.00 «Музычны рынг». 1989 год.
12.50 Фільм-канцэрт «Спявае Дзін Рыд».
14.30, 18.50 Канцэрт замежнай эстрады.
16.00 «Колба часу».
17.00, 23.00 «Погляд» ад 25 лістапада 1988 года.
19.15 Маст. фільм «Куды знік Фаменка?».
20.30 «Навагодні атракцыён». 1-е аддзяленне. 1984 год.
22.00 Канцэрт «Рок супраць тэрору». 1-я частка. 1991 год.
0.00 «Блакітны агеньчык» ад 7 лістапада 1970 года.
0.45 «Поле цудаў». 1991 год.
1.25 Фільм-спектакль М. Жванецкага «Птушыны палёт».
5.00 Фільм-канцэрт «Спявае Джо Дасэн».

EUROSPORT

10.30, 13.00, 1.00, 3.30 Ралі. ERC.
11.00, 18.45 Снукер. Міжнародны чэмпіянат. Фінал.
13.30, 2.00 Тэніс. Турнір Вялікага шлема. Адкрыты турнір ЗША. Фінал. Мужчыны.
15.30, 17.45 WATTS.
16.00 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
20.00 Тэніс. Турнір Вялікага шлема. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Фінал. Мужчыны.
22.00 Баявыя майстэрствы.
23.30 Байцоўскі клуб.
1.30 Тэніс. «Матс пойнт».

КАМЕДЫЯ

6.00, 10.00, 14.45, 17.30, 22.00, 3.10 Серыял «Сваты 3».

6.55 Камедыя «Татулі».
8.25 Камедыя «Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу».
10.55 Камедыя «Усмешка Бога, ці Чыста адэская гісторыя».
13.00 Камедыя «Парода бульдог».
15.35 Камедыя «Двое — гэта занадта».
18.20 Камедыя «Помста пушыстых».
19.55, 22.50, 0.50, 2.50, 5.45 Скетчком «Паміж намі».
20.20 Камедыя «Зорка сцэны».
23.10 Камедыя «Мы — легенды».
1.15 Камедыя «Заняпад мужчынскай імперыі».
4.05 Камедыя «Нядрэнна б пахудзець».

ТБ3

6.00 М/ф.
10.00 «Дом дагары нагамі».
10.55 «Хронікі маскоўскага побыту».
11.40, 5.30 «Гісторыі выратавання».
12.10, 1.30 «Тайны нашага кіно. «Дзесяць негрыцянят».
12.40, 2.00 Маст. фільм «Дзесяць негрыцянят».
15.00, 4.10 Дак. фільм «Лекі ад старасці».
16.30 «Свая праўда».
17.30 Дак. фільм «Фальшак».
19.00 «Даўно не бачыліся!».
20.30 Маст. фільм «Слухач».
22.20 Маст. фільм «Час ведзьмаў».
0.00 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

ТБ1000

6.10 Камедыя «Мой маленькі анёл».
8.05, 23.40 Камедыя «Людзі ў чорным».
9.50 Драма «Праз Сусвет».
12.20, 18.00 Баявік «Каралі Дагтаўна».
14.20 Трылер «Тормаз».
16.00 Камедыя «1+1».

20.00 Камедыя «Той самы чалавек».
21.40 Трылер «Філосафы: Урок выжывання».
1.30 Камедыя «Сімона».
4.00 Камедыя «Каханне з паведамленнем».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Прыгоды «Грэчаскія канікулы».
8.10, 4.30 Драма «Верабей».
10.00 М/ф «Вяртанне Бураціны».
11.30 М/ф «Карлік Нос».
13.10 Драма «Доўгія праводзіны».
14.55 Камедыя «Джэнтльмены, удачы!».
16.45 Драма «Падарожжа аўтастопам».
18.25 Драма «Гогаль. Найбліжэйшы».
20.20 Камедыя «Апельсінавы сок».
22.05 Баявік «Спіраль».
23.55 Камедыя «Свята пад замком».
1.20 Камедыя «Вось гэта каханне!».
3.00 Драма «З каханымі не расставайцеся».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
7.00 Золата Юкана.
8.00 Незвычайныя промыслы.
9.00 24 гадзіны, якія змянілі свет.
10.00 Космас: Прастора і час.
11.00 Гульня ў лікі.
12.00 Гульні розуму.
13.00 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
14.00 Дагістарычныя монстры Гітлера.
15.00 Невядомае падарожжа Дарвіна.
16.00 Тайнае жыццё драпежнікаў.
17.00 Зрабі або памры.
20.00 Горшае надвор'е ўсіх часоў?
21.00, 1.00, 4.00 Фатальная стыхія.
22.00, 2.00, 5.00 Крывавыя гісторыі.
23.00, 3.00 Дзесяць егіпецкіх пакаранняў смерцю.

DISCOVERY

8.00 Як гэта ўстроена?
8.25, 15.35 Хуткія і гучныя.
9.15 Выжыць разам.
10.10, 3.40 Беар Грылс: кадры выратавання.
11.05 Чалавек над Вялікім Каньёнам.
12.00, 4.30 На вышыні хмарачосаў.
12.50, 22.00 Склады: бітва ў Канадзе.
13.45, 6.10 Прапажы на продаж.
14.40 Вялікі махінатар.
16.30 Поўны фарсаж.
17.25 Што ў вас у гаражы?
23.00 Дзённікі вялікай вайны.
0.00 Глядзі ва ўсе вочы.
1.00 Як уладкаваны Сусвет.
1.55 Паўстанне машын.
2.50 Смяротны ўлоў.
5.20 Маланкавыя катастрофы.
5.45 Як гэта зроблена?
7.05 Багажныя войны.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

ЦІКАВА ДАВЕДАЦЦА

Нашы суайчыннікі ўваходзяць у сусветны рэйтынг вядучых шашачных кампазітараў. Таму часта пра іх з'яўляецца інфармацыя ў замежным друку. Што тычыцца, напрыклад, Барыса Уладзіміравіча Іванова *(на фота)*, дык яго імя згадваецца ў шмат якіх крыніцах, у тым ліку і ў выданні гросмайстра С. Юшкевіча «Гісторыя шашачнай праблематыкі» (Харкаў, 2013). Адзначаецца, што ён — чэмпіён Беларусі, нацыянальны майстар спорту, а з улікам паспяховых выступленняў на міжнароднай арэне — таксама майстар ФМЖД. Наступная складзеная ім канструкцыя на 100-клетачнай дошцы пацвярджае высокі клас мінчаніна. Разгледзьце яе — не пашкадуеце:



Белыя: 18, 20, 22, 27, 31, 32, 41, 42, 43, 48 (10). **Чорныя:** 7, 8, 9, 13, 15, 16, 24, 26, 29, 34 (10). Змест: 39, 19, 19-14, 1 (36) 40, 35 (42AB) 21, 37x. A(29) 40 (42C) 21, 37x. C(33) 44 (42) 11, 37 (12) 32 (18) 28x. B(17-21) 26x.

Барыс Іваноў нарадзіўся ў 1950 годзе, закончыў БДУ па спецыяльнасці «Матэматыка». Другую вышэйшую адукацыю атрымаў у Маскоўскім універсітэце па тэорыі музыкі. Адначасова захапляўся старадаўняй гульнёй. Па даручэнні Беларускай фэдэрацыі шашак (БФШ) быў адказным за развіццё кампазіцыі ў краіне, падрыхтаваў варыянт кодэкса па ёй. Свой багаты вопыт абагульніў у кнізе «Шашачная кампазіцыя. Сучасны погляд» («Асобны Дах», Мінск, 2003). Ужо 26 гадоў цікава і змястоўна вядзе шашачны клуб у газеце «Транспортный вестник».

ДЗЯСЯТЫ ТУР

У ім развяжыце заданне №22 конкурсу «Пагода ў доме-10»:

Белыя: a1, b2, c1, e3, f2, g3, h2, h6 (8). **Чорныя:** a5, b4, c5, d6, f8, g7, h4, дамка e1(8). Выйгрыш.

Адказы на працягу двух тыдняў накіроўвайце на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, газета «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

РАШЭННІ

«Восьмы тур (М. Грушэўскі): **№ 20.** B8, d8, c1, g3, g5/h6x.

■ Замор'е

Я ЭКАЛОГІЮ БЕРАГУ

Ёган Хубер, дасціпны баварскі фермер, надзеў самаробныя падгузкі на 18 сваіх кароў з мэтай паказаць абсурднасць новых прыродаахоўных нормаў ЕС аб забароне ўгнаенняў на схілах больш за 15 градусаў. Такім чынам ён арыгінальна пратэставаў супраць новых нарматываў.

Хубер расказаў, што стандартных падгузкаў для кароў пакуль не існуе, бо іх яшчэ не паспелі пачаць выпускаць на камерцыйнай аснове. Таму ён, не доўга думаючы, вырашыў зрабіць іх у хатніх умовах, гэтакі «хэндмэйд». Дарэчы, сям'я Хубераў на працягу апошніх некалькіх стагоддзяў паспяхова займаецца жывёлагадоўляй і лічыць новыя нарматывы абсурднымі, а фермеры Баварыі абураны такой дырэктывай. У ЕС жа наракаюць на тое, што фермеры ўспрымаюць рашэнне па барацьбе з нітратамі занадта літаральна, самастойна вылічваючы вугал схілаў.

МУМІЯ ЗНОЎ БУДЗЕ ПОМСЦІЦЬ?

Падчас агляду дома ў графстве Эсэкс (Вялікабрытанія) супрацоўнікі кампаніі Reeman Dansie Auctioneers знайшлі старажытнаегіпецкі саркафаг узростам каля 3000 гадоў.

Уладальніца памяшкання незадоўга да гэтага пераехала ў дом састарэлых і папрасіла супрацоўнікаў аўкцыённага дома ацаніць мэблю. Супрацоўнік кампаніі расказаў, што саркафаг, верагодна, належаў жанчыне высокага паходжання. Ён таксама адзначыў, што гэта самая старажытная са знаходак, якую яму ўдавалася сустрэць. Пазней высветлілася, што ўладальніца дому набыла саркафаг, калі закрыўся мясцовы музей. Эксперты аўкцыённага дома лічаць, што ён трапіў у Вялікабрытанію падчас напалеонаўскіх войнаў. Саркафаг быў ацэнены супрацоўнікамі Reeman Dansie Auctioneers ў £6000 (каля $10 000).

А ПАЧЫТАЮ Я КІЛАГРАМЧЫК...

У Кітаі сталі прадаваць кнігі на вагу, каб прышчапіць «любоў да чытання». Уладальнікі кнігарняў усур'ёз спадзяюцца павысіць такім чынам папулярнасць друкаваных выданняў сярод моладзі.

Кошт аднаго «цзінь» кніг (старажытны кітайскі фунт, цяпер прыраўнаваны да 500 грамаў) у залежнасці ад катэгорыі выданняў складае ад 11 да 25 юаняў (1,8–4,1 долара). Гэта істотна ніжэй кошту кніг, якія прадаюцца паштучна. Паводле паведамленняў СМІ, мясцовая моладзь станоўча адрэагавала на новаўвядзенне. У сярэднім кожны кітаец траціць на чытанне каля 8 гадзін штотыдзень.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

НЯДЗЕЛЯ, 9 ЛІСТАПАДА

БЕЛАРУСЬ 1

7.05 Серыял «Забыты». 3-я і 4-я серыі.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Арсенал.
9.40, 0.20 Серыял «Байкі Міцяя».
10.50 «Пра ежу!».
11.25 XXL WOMAN TV.
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35, 16.20 «Вялікі рэпартаж».
13.05 Тайны следства.
13.40 Каробка перадач.
14.15 Каб усё так geely!
14.50, 22.15 Вялікае тэлебачанне.
15.15 Твой горад.
15.30 Вакол планеты.
16.55 Я магу!
17.20 Меладрама «Самазванка». 1-я і 2-я серыі.
21.00 Галоўны эфір.
21.55 Навіны надвор'я.
22.25 Камедыя «Гудзонскі ястраб».

БЕЛАРУСЬ 2

6.55 Вышэй за дах.
7.25 Анімацыйны фільм «Рухай ластамі-2».
9.10 М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
10.20 «Fitnews».
11.00, 20.25 Тэлебарометр.
11.05, 21.30 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».
12.15 «Турыст».
13.05 Дэтэктыў «Разумнік». Заключныя серыі.
15.00 Ток-шоу «Перазагрузка».
15.50 Баявік «Хуткасць».
17.55 «Comedy Батл. Без межаў».
19.15 Суперлато.
20.05 Кіпень.
21.00 Спортлато 5 з 36.
21.05 КЕНО.
21.15 «На прыродзе».
22.40 Серыял «Гардэмарыны, наперад!». 3-я і 4-я серыі.
1.10 «Сустрэча з...».

БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 12.45, 15.40, 0.35 «Калейдаскоп».
8.15 Серыял «Робін з Шэрвуда».
10.50 «Подых струн». Музычная праграма.
11.30 «Наперад у мінулае».
11.55 Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
13.00 «Навукаманія». Медыцына XXI стагоддзя.
13.30 «Уладзімір Гасцюхін. Пагружэнне». Дак. фільм.
14.25 «Жыццё — музыка». Канцэрт памяці Лучана Павароці.
15.55 «Старыя казкі». Гісторыя стварэння мастацкага фільма «Капітан Змані-галава».
16.20 «Капітан Змані-галава». Маст. фільм. 1-я і 2-я серыі.
18.25, 22.05 «Культпрасвет».
19.00 Сусветнае кіно. «Камісар».
20.45 Калыханка.
21.05 «Веліч раманса». Канцэрт з удзелам Уладзіміра Александровіча.
22.40 І. Губач «Ад'ютант-Ша Яго Вялікасці». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага.

БЕЛАРУСЬ 5

8.00 PRO спорт. Навіны.
9.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Юнайтэд» — «Крыстал Пэлас».
10.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Чэлсі».
12.55 Гандбол. SEHA-ліга. «БГК ім. Мяшкова» (Беларусь) — «Вардар» (Македонія).
14.25, 23.10 Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. БАТЭ (Барысаў) — «Нафтан» (Наваполацк).
16.25 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Сандэрленд» — «Эвертан».
18.40 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
19.25 Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» (Беларусь) — «Зеніт» (Расія).
21.15 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Суонсі» — «Арсенал».

АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная пропаведзь (з субцітрамі).
9.20 «Смяшарыкі. ПІН-код».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.40 «Фазэнда».
11.10 «ТБ-таксі».
11.35 «Брэйн-рынг».
12.40 Камедыя «Джэнтльмены ўдачы».
14.15 «Я люблю Беларусь».
15.25, 16.20 Да юбілею Аляксандры Пахмутавай «ДОстояние РЕспублики».
16.15 Навіны спорту.
17.50 «Тэатр эстрады».
20.00 Контуры.
21.05 «Подых планеты».
21.40 «Ледніковы перыяд».
0.20 Камедыя «Афоня».

СТБ

6.05 Серыял «Студэнты 2».
7.40, 17.45 «Аўтапанарама».
8.10 Маст. фільм «Мушкецёр».
10.00 «Вялікае сняданне».
10.40 «Тэрыторыя памылак».
12.30 «Прывітанне, доктар».
13.05 «Ганна Чапман і яе мужчыны».
14.10 Маст. фільм «Вяртанне рэзідэнта». 2-я серыя.
15.35 «Глядзець усім!».
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
16.30 «24 гадзіны».
16.50 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
18.15 «На тым жа месцы ў той жа час».
19.30 «Тыдзень».
20.40 Маст. фільм «Пяты элемент».
23.00 Маст. фільм «Целаахоўнік».
0.55 «Глядзець усім!».

МІР

6.00 «Мільён пытанняў аб прыродзе».
6.15 М/ф.
9.05 «Ведаем рускую».
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 Дак. фільм «Жанчына, якая спявае».
11.10 Маст. фільм «Тры таполі на Плюшчысе».
12.35 Серыял «Адзін на ўсіх».
16.15, 22.00 Серыял «Жыць спачатку».
21.00 «Разам».
0.45 Маст. фільм «Поп».
3.05 Маст. фільм «Знахар».

БЕЛАРУСЬ РТР — РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Пакой смеху».
7.30 Маст. фільм «Пікавая дама».
9.10 Маст. фільм «У чаканні вясны».
11.00, 14.00 Весткі.
11.15 «Сам сабе рэжысёр».
12.10 «Смехапанарама».
12.40 «Ранішняя пошта».
13.20 «У свеце жывёл».
14.15 «ХА».
14.35 Маст. фільм «Падары мне трохі цеплыні».
16.20 Маст. фільм «Райскі куток».
18.15 «Смяяцца дазваляецца».
20.00 Весткі тыдня.
21.55 «Нядзельны вечар».
23.45 Маст. фільм «Паўцарства за каханне».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.05 Маст. фільм «Целаахоўнік».
6.50, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.50 «Медыцынскія тайны».
9.25 «Ядзім дома».
10.20 «Першая перадача».
11.05 «Цуд тэхнікі».
11.50 «Дачны адказ».
13.15 «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
14.15, 16.20 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч».
18.00 Надзвычайнае здарэнне.
19.00 «Сёння. Падагульняючая праграма».
20.10 «Ты не паверыш!».
21.15 Серыял «Вышук».

8 КАНАЛ

9.00, 12.25, 19.00, 21.00, 23.45 «Надвор'е».
9.05 Мультпарад.
10.05 «Адшукваецца адпачынак».
10.35 Меладрама «Джуна».
12.15 «Кінаблакнот».
12.30 Камедыя «Няўдачлівыя».
13.55 Баявік «Містар і місіс Сміт».
15.55 «МакаShow».
16.15 «Сёння клюе».
17.45 «Тэлемагазін».
18.10 Серыял «Эўрыка».
19.05 Трылер «Зыходны код».
20.45 «Вечарніца».
21.05 «Неверагодная магія».
21.15 Трылер «Код Да Вінчы».

ВТВ

6.00, 5.00 «PLAY».
8.30 М/ф «Смяшарыкі».
9.00 Серыял «Татавы дочкі».
10.00, 2.00 «Турба міксер».
12.00 «Паспець за 24 гадзіны».
13.00 «Тайны цела».
13.30 «Тайны ежы».
14.00 «Кіно ў дэталях».
15.00 Серыял «Васьмідзясятыя». Новы сезон.
16.30 Фантастыка «Знак».
19.00 «Уральскія пельмені».
20.30 Прыгоды «Чорнае золата».

23.30 «Нерэальная гісторыя».
0.00 «Людзі Хэ».
0.30 «Лаві момант».
1.00 «Ленінградскі Stand-up клуб».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00 «Звычайны канцэрт».
10.35 Маст. фільм «Па галоўнай вуліцы з аркестрам».
12.05 «Астравы». Алег Барысаў.
12.45 «Расія, любоў мая!». «Сібірскія татары».
13.10, 1.55 Дак. фільм «Зог і нябесныя рэкі». Частка 1-я.
14.05 Геніі і злодзеі. Мікалоюс Чурлёніс.
14.30 «Пешшу...». Вакзалы: Масква — Сочы.
15.00 «Што рабіць?».
15.45 «Хто там...».
16.10 25-я гадавіна падзення Берлінскай сцяны. Дак. фільм «Нямецкая крыжаванка. Цяжкасці перакладу».
17.05 Юбілей Аляксандры Пахмутавай. «Лінія жыцця».
18.00 «Кантэкст».
18.40 Гала-канцэрт у Маскоўскай кансерваторыі «Аляксандра Пахмутава і яе сябры...».
20.30 Да 70-годдзя Вялікай Перамогі. «Вайна на ўсіх адна».
20.45 Маст. фільм «Мефіста».
22.55 «Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра». Опера Дж. Пучыні «Турандот».
1.15 Дак. фільм «Чырвоны Эрмітаж».
2.50 Дак. фільм «Талейран».

НАСТАЛЬГІЯ

6.00, 12.00, 18.00 «Музычны рынг». 1989 год.
6.50 Фільм-канцэрт «Спявае Дзін Рыд». 1980 год.
7.30, 1.55 Тэлеспектакль «Ноч памылак!».
8.30 Канцэрт замежнай эстрады.
9.00, 3.00 «Мінулы час».
10.00 «Колба часу».
11.00, 17.00 «Погляд» ад 25 лістапада 1988 года.
12.50 Канцэрт замежнай эстрады.
13.15 Маст. фільм «Куды знік Фаменка?». 1981 год.
14.30, 20.30 «Навагодні атракцыён». 1984 год.
16.00, 22.00 Канцэрт «Рок супраць тэрору». 1991 год.
18.55 Маст. фільм «Прыстань на тым беразе».
20.00 «Пакуль усе дома». 1992 год.
22.45 Фільм-канцэрт «Сустрэчы з Алай Пугачовай».
0.00 Ваенны парад і дэманстрацыя працоўных 7 лістапада 1974 года.
1.00 «Праграма «А». 1990 год.
4.00 «Народжаныя ў СССР».
5.00 «Песня-77».

EUROSPORT

10.30, 14.45 Ралі. ERC.
11.00, 15.15 WATTS.
12.00, 16.00, 1.45 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
15.30 All Sports.
18.45 Конны спорт. Спаборніцтвы па скачках.
20.00 Тэніс. Турнір Вялікага шлема. Адкрыты турнір ЗША. Фінал. Мужчыны.
22.00 Бокс. C. Hammer (Германія) — Costa Junior (Бразілія).
23.30 Аўта- і мотаспорт.
23.45 Фігурнае катанне. Гранпры. Канада.

КАМЕДЫЯ

6.00, 10.05, 14.30, 17.30, 22.00, 3.20 Серыял «Сваты 3».
6.55 Камедыя «Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу».
8.30 Камедыя «Парода бульдог».
10.55 Камедыя «Двое — гэта занадта».
12.50 Камедыя «Помста пушыстых».
15.20 Камедыя «Мы — легенды».
17.00, 19.55, 22.55, 0.50, 5.45 Скетчком «Паміж намі».
18.20 Камедыя «Зорка сцэны».
20.20 Камедыя «Сутэнёр».
23.10 Прыгоды «Дарога ў Занзібар».

1.15 Камедыя «Усмешка Бога, ці Чыста адэская гісторыя».
4.10 Камедыя «Заняпад мужчынскай імперыі».

ТБ3

6.00 М/ф.
10.00 «Дом дагары нагамі».
10.50 «Паненка і кулінар».
11.30, 2.55 Серыял «Тайны следства».
14.50 «Жонка. Гісторыя кахання». Клара Новікава.
16.10 «Сто пытанняў даросламу». Расціслаў Хаіт.
17.00 «Без падману».
17.50 «Доказ віны».
18.20 Маст. фільм «На грэбні хвалі».
20.30 Маст. фільм «Дзеці Хуанг Шы».
22.40 «Асцярожна, махляры!».
23.10 «Часова даступны». Валерый Меладзэ.
0.10 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».
1.40 Дак. фільм «Фальшак».

ТБ1000

6.10 Камедыя «Вампіркі».
8.05 Трылер «Філосафы: Урок выжывання».

10.10 Камедыя «Сімона».
12.15 Камедыя «Каханне з паведамленнем».
14.10 Камедыя «Той самы чалавек».
15.40 Драма «Дзённік памяці».
17.50 Камедыя «Салодкі лістапад».
20.00 Камедыя «Каханне з перашкодамі».
22.00 Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
0.00 Баявік «Чалавек-павук».
2.10 Драма «Тысяча акраў».
4.10 Драма «Каханне і гонар».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Камедыя «Прыгоды жоўтага чамаданчыка».
7.45 М/ф «Пра Фядота-стральца, удалага малайца».
9.05 Камедыя «Кіндар-Вілейскі прывід».
10.45 Меладрама «Восеньскія клопаты».
12.20 Драма «Ганна і камандор».
13.50 Камедыя «Свята пад замком».
15.15 Драма «Чэмпіёны».
16.55 М/ф «Смяшарыкі. Пачатак».
18.30 Прыгоды «Прыватнае піянерскае».
20.20 Драма «Дом».
22.35 Камедыя «Вострай шанцавання».
0.10 Трылер «Апошні ўікэнд».
1.50 Драма «Мелодыя для катрынкі».
4.30 Меладрама «Кароткія сустрэчы».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Супербудаванні Трэцяга рэйха.
7.00 Золата Юкана.
8.00 Незвычайныя промыслы.
9.00 У пошуках да Вінчы.
10.00 Космас: Прастора і час.
11.00 Гульня ў лікі.
12.00, 17.00 Гульні розуму.
13.00 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
14.00 Супербудаванні.
15.00 Лясное царства.
16.00 Тайнае жыццё драпежнікаў.
19.00, 23.00 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
22.00, 2.00, 5.00 Хасэльхаф супраць Берлінскай сцяны.
23.00, 3.00 90-я: найвялікшыя футбольныя моманты.
0.00 90-я: найвялікшыя трагедыі.

DISCOVERY

8.00 Як гэта ўстроена?
8.25 Склады: бітва ў Канадзе.
9.15 Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
23.00 Глядзі ва ўсе вочы.
0.00, 3.40 Звышчалавечая навука.
1.00, 5.20 На вышыні хмарачосаў.
1.55 Выжыць разам.
2.50 Тыкль.
4.30 Чалавек над Вялікім Каньёнам.
6.10 Поўны фарсаж.
7.05 Вялікі махінатар.

■ Выратаваць гісторыю

ДОБРАЎПАРАДКАВАЦЬ НЕЛЬГА ЗНІШЧЫЦЬ

Старажытныя могілкі ў цэнтры Дзяржынска — пад пагрозай знікнення

Сталічны стадыён «Дынама» пабудавалі на самых старажытных у горадзе яўрэйскіх могілках. У Гродне тагачасныя праекціроўшчыкі на месцы старых лютэранскіх могілак, што знаходзіліся насупраць кірхі, паставілі... дзіцячы садок. Ледзь не вырасла забудова на колішнім сталічным Старажоўскім рынку, на месцы якога былі могілкі салдат Першай сусветнай вайны. Дзякуй Богу, своечасова адумаліся, і сёння там паўстаў выдатны мемарыял. І быццам бы можна ўжо казаць пра павышэнне ўзроўню культуры народа адносна захавання памяці пра сваіх памерлых, як наспела чарговая праблема — гэтым разам у горадзе-спадарожніку Дзяржынску, колішнім Койданаве.

Горад прыгажэе на вачах. Перакладваюць асфальт, прыводзяць у парадак фасады і дахі дамоў, усюды чысцяць, латаюць, падфарбоўваюць. Узяліся і за рэканструкцыю і добраўпарадкаванне старых гарадскіх могілак, што на вуліцы 2-я Ленінская. Гэтаму некропалю каля 200 гадоў, амаль паўстагоддзя ён мае статус закрытага (некалькі апошніх пахаванняў датуюцца 1969 годам). Раней на могілках раслі вялікія таўшчэзныя дрэвы. На пачатку 2000-х іх спілавалі — усе разам. Але гэтае рашэнне, як паказаў час, было недаравальна памылковым. На зямлю без перашкод хлынулі сонечныя промні, паступова ўся тэрыторыя шчыльна парасла непразнымі хмызамі, і гэта стала галаўным болем як для наведвальнікаў магіл, так і для камунальнікаў. Непрывабны знешні выгляд месца пахаванняў прымусіў гарадскія ўлады спешна прымаць рашэнне аб яго добраўпарадкаванні, аб чым сёлета ў сярэдзіне мая паведамілі ў мясцовай газеце. Увогуле справа добраўпарадкавання могілак складаная і вельмі далікатная. Прыкладаў, як правільна гэта рабіць, улічваючы тыя ці іншыя акалічнасці, у нас няшмат. Таму і прапановы ўзнікаюць розныя: ад таго, каб ачысціць усё рукамі, да таго, каб зраўняць бульдозерам пагост з зямлёй і, у лепшым выпадку, паставіць агульную памятную шыльду. Аднак, паводле аднаго з варыянтаў добраўпарадкавання, усе каменныя надмагіллі павінны быць вывезены на сметнік.

Мясцовыя краязнаўцы затурбаваліся: калі надмагіллі знішчаць ці выкінуць, вялізная частка памяці пра гісторыю горада можа проста знікнуць. Ініцыятыўная група, хутка створаная дзяржынскім гісторыкам-краязнаўцам Андрэем Бараноўскім, у склад якой увайшлі сваякі пахаваных, педагогі, гісторыкі, краязнаўцы, архітэктары, падрыхтавала і накіравала ў Дзяржынскі райвыканкам калектыўны ліст са сваімі прапановамі па захаванні і далейшай мемарыялізацыі могілак. Пазней да справы далучыўся Беларускі камітэт ІКАМОС (Міжнародная Рада па помніках і мясцінах (ICOMOS) — адзіная міжнародная

Бульдозер карчуе не толькі кустоўе, але і магілы.

грамадская арганізацыя, скіраваная на падтрымку і прасоўванне тэорыі, метадалогіі і навуковых тэхналогій у кансервацыі архітэктурнай і археалагічнай спадчыны).

— Галоўным з шасці пунктаў нашых прапаноў я лічу захаванне старадаўніх надмагільных пліт і помнікаў, — расказвае Андрэй Бараноўскі. — Бо могілкі — неад'емная частка культурнага пластычнага ландшафту горада. Гэта архітэктурна-мастацкі ансамбль, цікавы гісторыка-культурны аб'ект, найкаштоўнейшая крыніца інфармацыі аб нашай мінуўшчыне, колішнім жыцці нашага роднага горада і яго людзях, своеасаблівы музей пад адкрытым небам. Гэта не толькі матэрыяльны, але і духоўны аб'ект. Ён мае сімволіку пераемнасці пакаленняў.

Апроч бульдазерыста, разам са мной было шэсць чалавек, з якіх чацвёра прыехалі з Мінска. Дык чый жа клопат — захоўваць памяць аб тых, хто спачыў?..

На некропалі пахаваны многія, хоць і лакальна, але вядомыя асобы. Яны будавалі горад, абаранялі яго ад ворага. Апошні спачын тут знайшлі і праваслаўныя, і каталікі. Калісьці ў цэнтры могілак на пагорку стаяла драўляная Свята-Георгіеўская царква, прыпісаная да галоўнага прыходскага Свята-Пакроўскага праваслаўнага храма колішняга мястэчка, дзе служылі вядомыя святары. А яшчэ гэта адзіныя старажытныя могілкі ў сучасным Дзяржынску, што захаваліся да нашых дзён. Бо татарскія, кальвінскія, яўрэйскія некропалі, крыпта кальвінскага збору, прыкасцёльны цвінтар, царкоўны пагост былі вынішчаны дарэшты.

Ратаванне некропаля — ратаванне нашай гісторыі, нашай спадчыны. Паралельна з добраўпарадкаваннем дзяржынскія краязнаўцы сумесна з мінскімі валанцёрамі праводзяць карпатлівую працу па фотафіксацыі і пашпартызацыі помнікаў. Яе вынікі папоўняць рэспубліканскую базу даных гістарычных могілак Беларусі niekropali.by.

— Вываз надмагілляў фактычна азначаў бы ліквідацыю могілак, што проста так не робіцца. Гэта асобная юрыдычная працэдура, — тлумачыць кіраўнік адукацыйных праектаў Беларускага камітэта ІКАМОС Цімафей Акудовіч. — Згодна з заканадаўствам, ліквідацыя могілак магчымая толькі ў крайніх выпадках. Напрыклад, у сувязі з прыроднымі катаклізмамі — такімі, як затапленні, апоўзні і ім падобныя.

Да таго ж, працягвае Цімафей, калі могілкі ператвораць у звычайны газон, пабудаваць на ім усё адно нічога нельга, бо, па законе, на ліквідаваных могілках будоўля забаронена.

— Бессэнсоўна рабіць тут толькі газон, калі на гэтым месцы можа быць прыгожы некропаль накшталт сучасных еўрапейскіх, дзе можна прайсціся і аддаць даніну памяці спачыўшым тут людзям, — лічыць гісторык.

Па яго словах, у выканкаме адбылася прысвечаная праблеме сустрэча, на якой прысутнічалі кіраўнік мясцовай ЖКГ і галоўны пракурор раёна. Яны выступілі за захаванне могілак. Са свайго боку, валанцёры прапанавалі як навукова-практычную, так і фізічную дапамогу — расставіць помнікі на месцы, зрабіць частковую рэстаўрацыю. Удалося дасягнуць вуснай дамоўленасці з кіраўніцтвам ЖКГ аб тым, што бульдозеры здымуць дзёран, ліквідуюць спарахнелыя агароджы і ржавыя крыжы без надпісаў. Але, галоўнае, надмагіллі вывозіцца не будуць. А пакуль тут выкарыстоўваецца тэхніка, працуюць некалькі рабочых ЖКГ, на суботнікі прыводзілі салдат і работнікаў мясцовых прадпрыемстваў.

Аднак працы ўсё адно непачаты край. Цяпер усё выглядае непрывабна: узараная зямля, перакуленыя крыжы і агароджы, вывернутыя надмагіллі. І сярод усяго гэтага — адзінокі бульдозер, што ўпарта карчуе буйное кустоўе ля магіл.

— Кажуць, паступова тут усё выраўняюць, навядуць парадак, — адказвае на пытанне аб тым, што тут будзе, бульдазерыст; але як гэты «парадак» будзе выглядаць, не ўдакладняе. — Не, руйнаваць тут усё нельга. Няправільна гэта, не па-чалавечы магільныя пліты выкідваць, — разважае мужчына і зноў прымаецца за працу.

Мы звязаліся са старшынёй Дзяржынскага райвыканкама Мікалаем Арцюшкевічам.

— Я даў даручэнне работнікам ЖКГ, каб яны дзейнічалі ў адпаведнасці з заканадаўствам. Могілкі закрытыя, іх трэба даглядаць, — сказаў старшыня.

За тры дні да талакі, да якой я далучылася, у раённай газеце з'явілася абвестка, у якой кіраўніцтва Дзяржынскай ЖКГ звярталася з заклікам да прыхаджан царквы і касцёла, да ўсіх неабыякавых гараджан прыняць удзел у суботніках па добраўпарадкаванні тэрыторыі і навядзенні парадку на могілках. Апроч бульдазерыста, разам са мной было шэсць чалавек, з якіх чацвёра прыехалі з Мінска. Дык чый жа клопат — захоўваць памяць аб тых, хто спачыў?..

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
Фота аўтара.

Дзяржынск

Надмагіллі, што не паспелі вывезці, валанцёры паставяць на месцы.

■ Неасабісты суб'ектыў

ЧУЖЫЯ СЯРОД ЧУЖЫХ

Пра хэлоўін, гістарычную памяць і нацыянальную ідэю

СЦЕРАЖЫЦЕСЯ, людзі добрыя! У гэтыя выхадныя, пачынаючы з сённяшняга вечара, нас чакае «страшная радасць» і «д'ябальскія вечарынкі». Прынамсі так абяцаюць шматлікія забаўляльныя ўстановы сталіцы і буйных гарадоў. Набліжаецца хэлоўін — час панавання нечысці на зямлі паводле кельцкай традыцыі. І гэту самую нечысць можна будзе пабачыць на вуліцах, прычым цэлым натоўпам. Да аматараў начнога вясёлага жыцця ў гэтым шабашы далучацца студэнты першых курсаў, што прыехалі з правінцыі. Яны дагэтуль паглядалі на стракатыя шыльды начных клубаў, якія вабілі да сябе, але былі недасяжнымі для бюджэту. А тут — вось шанцаванне! — зрабіў з сябе ведзьму, зомбі ці проста начапіў на галаву зроблены з падручных сродкаў «гарбуз» — і ты ў тусоўцы, бо ўваход у гэтыя дні ўсім, хто зменіць сваё чалавечае аблічча на нечалавечае, у клубы і на дыскатэкі абяцаюць бясплатны. Атэлье прапануюць д'ябальскае адзенне пашыць, гандляры ў інтэрнэце — купіць. Толькі вось бяда — касцюм супраць Эбола, такі папулярны на захадзе, да нас не давезлі... «Што, зрэшты, не перашкаджае зрабіць маскарадны касцюм самому, — падбадзёрвае адзін з папулярных сайтаў і тут жа абнадзейліва дадае: — Калі ж у гэты дзень вы засталіся дома, гэта не нагода ігнараваць хэлоўін. Можна ўпрыгожыць жытло ліхтарыкамі, выразанымі з гарбуза, падаць на стол стравы выключна чырвонага колеру (што, па задумцы, сімвалізуе, вядома ж, кроў. — **Аўт.**) і смела запрашаць сяброў на ўласную д'ябальскую вечарынку»...

Рэстараны ў гэтыя вечары рыхтуюцца да таго, што будзе больш чым калі-небудзь попыт на біфштэксы з крывёю, а тураператары скрушна канстатуюць, што паездкі ў гэтыя дні па «прывідных мясцінах» пакуль не карыстаюцца ў суайчыннікаў папулярнасцю, але спадзяюцца, што ў хуткім часе сітуацыя зменіцца.

ТАКАЯ вось восеньская вакханалія, якая з кожным годам, здаецца, усё больш набірае моц і размах. Амаль заглушаючы ўжо голас святароў, якія нагадваюць і пра сатанінскую сутнасць гэтых «свят», і пра галоўнае — менавіта ў гэтыя дні ў каталікоў — Задушны дзень, а ў праваслаўных — бацькоўская Дзмітрыеўская субота. Амаль перакрываючы нахабнай рэкламай генную спрадвечную памяць: у гэтыя дні — Дзяды. На пачатку лістапада на Беларусі спрадвеку трымцяць агні мільёнаў свечак, гучыць ва ўсіх храмах «Вечны спачын», за вялікім сталом збіраецца ўся сям'я, каб запрасіць на вячэру памерлых продкаў — бацькоў, дзядоў і тых далёкіх прашчураў, якія далі калісьці пачатак роду... Але калі так пойдзе далей, ці не давядзецца гэтыя зразумелыя, простыя, як хлеб, як дыханне, як маці, рэчы пісаць у незваротна прошлым часе?

І гэта не бурчанне строгай ханжы і не вохканне «касцельнай дэваткі». Нічога не маю супраць весялосці, містычных гісторый — сама і да таго, і да другога не раз спрычынілася. Тут пытанне іншае, якое сягае далёка за межы таго няшчаснага хэлоўіна — старажытнага кельцкага свята, якое знаходлівыя амерыканцы ператварылі ва ўдалы камерцыйны праект і ў патрэбны час нам неназойліва падсунулі. Тут размова пра наша месца на гэтай зямлі. Пра тое, кім мы самі сябе на ёй лічым. Пра гістарычную памяць, якая — бясспрэчны факт, даказаны і сацыёлагамі, і палітолагамі — самы надзейны падмурак існавання нацыі.

ЗАНАДТА гучна? А гэта як паглядзець. На дні нараджэння ўсё часцей спяваем «Хэпі бёздэй!», самі машынальна вымаўляючы іншаземныя словы і прыводзячы ў стан лёгкага шоку вясковых бабуль, якія ў гэтым віншаванні, акрамя як «паскудства», нічога не чуюць. На вяселлі замест традыцыйнага каравая ўсё часцей ставім шмат'ярусны крэмавы торт, з якога добра што аголеная дзеўка пакуль не выскоквае, дзяльбу гэтага самага торта ператвараем у збор грошай і падарункаў... Танец з падвязкай — гэта абавязкова, як жа без гэтага абысціся, калі малады гэту падвязку са сцягна маладой зубамі не сцягне — ніякага ім шчасця не будзе. І нават на пахаванні ўсё часцей хаваем вочы за цёмнымі акулярамі, бо не трэба, каб людзі бачылі шчырыя слёзы, бо ў галівудскіх фільмах менавіта так развітваюцца з блізкімі людзьмі. Ну і, вядома ж, як жа мы без хэлоўіна? Мы ж тады без яго, як і без гамбургераў, што з апетытам топчам на абед (не таму, што нам надта смачна, а таму, што гэта «не наша, а значыць лепшае»), не будзем падобныя на «цывілізаваны свет»... Можа, у такіх вось бытавых дробязях і трэба пачынаць шукаць вытокі нацыянальнай ідэі, якую ніяк не намацаем?

Ці мы спадзяёмся, што калі ўсе разам кінемся ў скокі ў пачварных масках (калі ўжо вельмі карціць, чаму б не паскакаць на Каляды ці на Купалле?) замест таго, каб пайсці ў храм памаліцца за спачын душы блізкіх людзей ці проста ціха пасядзець вечарам і іх успомніць, «цывілізаваны свет» прыме нас за сваіх? Марныя спадзяванні. Гісторыя сведчыць: у любой чалавечай суполцы, нават амаль пазбаўленай маралі, тыя, хто адрокся ад сваіх, ні павагі, ні права голасу не маюць.

